КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 45 (1171) 8 лістапада 2014 г.

Колькі слоў **пра слова "кансервацыя"** С. 2 — 3

Што ў планах Гомельскай абласной? С. 6

На маю думку: **тры меркаванні ад экспертаў** С. 5

Сябра ці канкурэнт: прыватны музей С. 12

Досвед фольку: **Польшча і Швецыя** С. 14

НАЦЫЯНАЛЬНЫ КОНКУРС

стане адной з галоўных адметнасцей сёлетняга XXI Мінскага Міжнароднага кінафестывалю "Лістапад", што распачаўся ўчора і завершыцца 14 лістапада. У ім прадстаўлены 23 стужкі — іграваыя, дакументальныя, анімацыйныя.

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

Акцыя "К": журналісцкі аўтапрабег па СДК і не толькі

Прыгоды фондаў завяршаюцца?

Партрэт германавіцкай культуры ў вясковым інтэр'еры

Сёння — пра Германавічы. Дакладней — пра ўстановы культуры гэтай выбітнай вёскі. А адметная яна не толькі велічным касцёлам Перамянення Пана, узведзеным напрыканцы XVIII стагоддзя.

На сёння ў палацы Шырыных, колішніх уладальнікаў паселішча, месціцца Германавіцкі музей культуры і побыту з унікальнай калекцыяй работ Язэпа Драздовіча — адзін з асноўных аб'ектаў нашай увагі пад час гэтага аўтапрабегу. Апроч усяго, жывуць і працуюць тут вельмі адметныя людзі-творцы, сустрэча ды размова з якімі для журналістаў — як шчаслівая знаходка. Ніяк не маглі адмовіць сабе ў гэтым задавальненні.

Яўген РАГІН,
Кастусь АНТАНОВІЧ

Новае памяшканне — музею ратаванне

Спачатку наведалі Германавіцкі музей культуры і побыту. Прычына такога выбару зразумелая: "К" двойчы пісала пра тое, што ўстанове неадкладна патрэбны дадатковыя памяшканні для захавання фондаў. У адваротным выпадку, сапсуюцца-знікнуць маляванкі і карціны Драздовіча —усе работы знакамітага вандроўніка ў музейнай экспазіцыі проста не ўмяшчаюцца… А акрамя твораў Язэпа Драздовіча ў фондах маюцца і работы Пётры Сергіевіча, Віталя Цвіркі… Шэраг твораў, як мы паведамлялі ў мінулым матэрыяле аўтатура, прывезлі ў Германавічы з Лужкоў, з, так бы мовіць, "аптымізаванага" музея.

Сустрэла нас дырэктар установы Людміла Навіцкая, якая пачала размову з добрых навін: не так даўно адбылося частковае пашырэнне музея — пад фонды аддалі памяшканні дзіцячага садка. Зараз жа перад раённымі ўладамі стаіць пытанне, каб увесь будынак колішняй сядзібы аддаць пад музей, які пакуль дзеліць дах разам з агульнаадукацыйнай школай.

Чакаюць свайго часу і музейныя скляпенні, пра якія калісьці таксама пісала "К". Па словах Людмілы Навіцкай, вада цяпер там хоць і не "стаіць", але, каб зрабіць памяшканні прыдатнымі для экспазіцыі ці фондаў, патрэбна ўцяпленне і якасная гідраізаляцыя, што дапаможа перамагчы вільгаць. Вядома, на гэта патрэбны грошы, і немалыя. Спадзяюцца ў музеі на дапамогу як з боку дзяржавы, так і прыватных мецэнатаў, у тым ліку замежных. Так, у рамках беларуска-польскага супрацоўніцтва па стварэнні турыстычных маршрутаў польскі бок зацікаўлены ў супольнай працы з установамі культуры Германавічаў. Мясцовыя музейшчыкі ўжо прынялі ўдзел у семінары па стварэнні сайта, якога ўстанове па-ранейшаму не стае.

Часам даводзіцца назіраць, як беларускія гарады змагаюцца за таго або іншага славутага дзеяча. Логіка тут простая: імя чалавека ўзроўню таго ж Драздовіча — гэта выдатны брэнд. У справе папулярызацыі творчасці Язэпа Драздовіча германавіцкі музей актыўна супрацоўнічае з калегамі з Глыбокага, для якіх мастак даўно стаў сапраўдным брэндам па прыцягненні турыстаў. У гэтай справе, думаецца, важна не перацягванне коўдры, а падтрымка і дапамога адно аднаму.

Пакуль жа германавіцкія музейшчыкі толькі на пачатку шляху таго самага брэндзіравання — ужо колькі гадоў вырашаецца пытанне аб наданні музею імені славутага мастака. У перспектыве, па словах Людмілы Навіцкай, чакаецца стварэнне віртуальнай экскурсіі ў Інтэрнэце па ўсіх вядомых творах Драздовіча, а магчыма — і ўстаноўка ў музеі інфакіёска. Ёсць задумкі і як зарабляць: выпускаць тыя ж паштоўкі, магніты з выявамі карцін і дываноў мастака. Тым больш, цяпер музей мае статус юрыдычнай асобы. Іншая справа, што пакуль на гэтую справу не знайшоўся камерцыйны партнёр. У выніку музей сваімі сіламі выдае маляўнічыя буклеты, прысвечаныя Германавічам і Лужкам, што, безумоўна, добра, але — недастаткова для шматлікіх аматараў творчасці Язэпа Драздовіча, якія завітваюць на яго малую радзіму…

Заканчэнне артыкула чытайце **на старонках 10 — 11.**

9 771994 478007 14045

Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 60-годдзем **народнага артыста Беларусі Ігара Алоўнікава**.

Небам адзіным…

З юрыдычнага гледзішча самалёт, як і карабель, з'яўляецца тэрыторыяй краіны, якой ён належыць. Такім чынам, для пасажыра "Белавія" Беларусь пачынаецца не ў час прызямлення ў нашым аэрапорце і нават не тады, калі самалёт уваходзіць у паветраную прастору краіны, а як толькі вандроўнік ступае на борт лайнера. Уражанне ж ад краіны наведання пачынае фарміравацца ў замежніка з таго моманту, як ён бачыць беларускі самалёт. Гэта не навіна. Нездарма, зыходзячы з логікі менеджменту, дызайнеры імкнуцца рабіць лагатыпы авіякампаній ды расфарбоўку самалётаў не толькі інфарматыўнай, але і вобразнай.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Стыль кампаній, якія маюць статус "нацыянальнага перавозчыка", звычайна грунтуецца на колерах дзяржаўнага сцяга, стылізаванай нацыянальнай сімволікі. Згадаем, да прыкладу, савецкі, а сёння — расійскі "Аэрафлот", "Air France", галандскую авіякампанію "KLM". Нярэдкае і выкарыстанне ў такім кантэксце выяў "нацыянальных" жывёл ды раслін (кенгуру ў Аўстраліі, кляновы ліст у Канады) або міфічных вобразаў (птушка Фенікс на лагатыпе "Air China"). Даволі папулярныя ў якасці авіяцыйных сімвалаў стылізаваныя выявы птушак, у тым ліку буслоў і журавоў.

Прыгожая выява на хвасце самалёта не заменіць тэхнічнай дасканаласці і надзейнасці паветранага карабля, але ўдалы лагатып можа паспрыяць прасоўванню тавару (у гэтым выпадку — камфорту і бяспекі пасажыраў) на рынку транспартных паслуг. Гэта разумеюць і ў "Белавія", дзе, здаецца, усур'ёз ўзяліся за рэбрэндынг кампаніі.

І тут дарэчы аказаўся праект Ілы Андрэева, беларускага дызайнера, які зараз працуе ў Маскве. Распрацаваны ім вобраз радыкальна адрозніваецца як ад існага аблічча "Белавія", так і ад растыражаванай у Сеціве ідэі стварэння новага іміджа авіякампаніі на аснове арнаментыкі беларускага народнага ткацтва (па аналогіі з "Хахламой" на бартах "Аэрафлота" — ёсць такі праект).

Уся грамадзянская авіяцыя постсавецкай прасторы ("Белавія" ў тым ліку) выйшла з "Аэрафлота". Таму натуральна, што ў фірменным стылі нацыянальных кампаній сямтам прысутнічаюць "родавыя знакі" савецкай эпохі. Гэта не добра і не кепска. Такая "архаіка" можа сімвалізаваць грунтоўнасць, стабільнасць, захаванне станоўчых традыцый, што вельмі пасуе такой сферы паслуг, як паветраны транспарт. Але каб цябе заўважылі і вылучылі сярод мноства канкурэнтаў, трэба мець адмысловае аблічча, якое кідаецца ў вочы і добра запамінаецца.

Гэтая якасць якраз і ёсць у праекце спадара Андрэева. Ён прапаноўвае зрабіць знакам "Белавія" стылізаваны васілёк, на фоне якога мусяць размясціцца літары "А" і "Б" — кірыліцай або лацінкай, — спалучаныя, як плюсам, выявай маленькага самалёціка. Гэта трактуецца як "з пункта А у пункт Б — самалётам". Самі ж літары з'яўляюцца абрэвіятурай словазлучэння "Авіялініі Беларусі" ("Air Belarus"). Аўтар лічыць, што такая назва пасуе нашай грамадзянскай авіяцыі больш, чым "Белавія" і "Беларускія авіялініі", бо яна больш інфарматыўная: дакладна вызначае геаграфічную прывязку і выключае магчымасць іншага прачытання. Прапанаваная назва і вытворная ад яе абрэвіятура — бадай, самы спрэчны момант у праекце. Я думаю, аўтар спачатку прыдумаў гэтае "А+Б", а ўжо потым пад візуальны вобраз "падагнаў" не надта пераканаўчую канцэпцыю.

Усё ж такі назва "Белавія" ўжо раскручаная, звыклая і мілагучная. Адмаўляцца ад яе, губляць яе не варта. У свеце шмат нацыянальных кампаній, чые назвы пачынаюцца са слова "air", і наша проста згубіцца ў натоўпе. На маю думку, "Air Belarus" ("Авіялініі Беларусі") можа быць "падзагалоўкам", прыдаткам да назвы "Белавія", як "Расійскія авіялініі" — да назвы "Аэрафлот".

Мабыць, мае сэнс дапрацаваць шрыфт, якім будуць рабіцца надпісы на бартах самалётаў. А таксама падумаць пра тое, каб выява васілька пры памяншэнні (скажам, на паліграфіі, на рэкламных улётках і дзелавой дакументацыі "Белавія") не страціла графічнай выразнасці, не ператварылася ў аморфную блакітную пляму.

Праект Ілы Андрэева выклікаў вялікую цікавасць у карыстальнікаў Сеціва. Водгукі ў асноўным пазітыўныя. Праўда, ёсць і меркаванні, што прыгожая эмблема не надасць прывабнасці авіякампаніі, калі рэбрэндынг толькі гэтым і абмяжуецца і ў кампаніі не адбудзецца іншых пазітыўных змен.

З гэтым згодны і намеснік гендырэктара "Белавія" па маркетынгу і знешнеэканамічнай дзейнасці Ігар Чаргінец. Ён кажа: "Проста перафарбаваць самалёты — гэта не рэбрэндынг. Пры рэбрэндынгу змяняецца ўсё: і філасофія кампаніі, і сэрвіс, а ўжо потым гэтыя змены адлюстроўваюцца ў вонкавых праявах". Правесці рэбрэндынг "Белавія" дапаможа кампанія "Боінг". На дзелавую сустрэчу супрацоўнікаў нашай і амерыканскай кампаній запрошаны Ілья Андрэеў. Значыць, васілёк з самалёцікам апынуўся ў патрэбны час і трапіў на патрэбнае вока. Сказана ў Пісанні: "Стукайце ў дзверы, і вам адчыняць".

У Андрэя Вазнясенскага ёсць верш "Васількі Шагала". Не стану цытаваць твор цалкам — хто захоча, той сам верш знойдзе. А ёсць там слушная думка: блакіт васілька, у якім адбіўся блакіт неба. "Айчыны розныя — неба адзінае. Небам адзіным жывы чалавек!". Шануючы Марка Шагала, Андрэя Вазнясенскага і Рыгора Барадуліна, які пераклаў той верш на беларускую мову, я вітаю васілёк на самалётах "Белавія". "Небам адзіным". Форма — беларуская, змест — глабальны.

К

Міжнародны навукова-практычны семінар "Інтэграцыйны падыход у кіраванні аб'ектамі сусветнай спадчыны" вонкава нагадваў чарговую "V.I.P.-тусоўку" для вузкага кола прафесіяналаў. Прынамсі, такую атмасферу стваралі шыкоўныя неакласіцыстычныя інтэр'еры Штабкватэры СНД, дзе праходзіла першае з пасяджэнняў. На наступны дзень шаноўныя госці з Арменіі, Азербайджана, Літвы, Расіі, Украіны перамясціліся ў Нясвіж, дзе ў значнай меры ўжо адноўлена радзівілаўская раскоша... Тым не менш, семінар не стаў "пратакольным" мерапрыемствам, якое ставіць за мэту засведчыць, што і ў нас ёсць чым ганарыцца. Многія з узнятых на яго пасяджэннях праблем маюць самае непасрэднае дачыненне да нашай не надта шыкоўнай пакуль паўсядзённасці.

Ілья СВІРЫН

Ратавальнікі

Прыкладам, ці не ўпершыню ў айчынны ўжытак былі ўведзены новыя паняцці — уласна, "інтэграцыйны падыход у кіраванні аб'ектамі спадчыны" і "ўстойлівы турызм". Апошні тэрмін азначае пэўны парытэт паміж камерцыяй ды задавальненнямі патрэб карыстальніка і захаваннем самога аб'екта, раскрыццём ягонага патэнцыялу. Тэрмін зазвычай прымяняецца ў экалагічным аспекце, хаця ён цалкам дарэчы і ў дачыненні да культурнай спадчыны. Праўда, у нас пакуль цяжка знайсці прыклады "знясільвання" хаця б якога з іх навязлівымі турыстамі. Інтэграцыйны ж падыход прадугледжвае стаўленне да гісторыка-культурных каштоўнасцей не як да "рэчаў у сабе", але ў кантэксце тых размаітых з'яў, якія іх атачаюць.

— Да сённяшняга часу само паняцце спадчыны зведала пэўныя змены, — патлумачыла загадчык аддзела па ахове гісторыка-культурнай спадчыны адпаведнага ўпраўлення Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Наталля Хвір. — Калі раней у фокусе ўвагі спецыялістаў былі асобныя аб'екты, дык цяпер мы звяртаем увагу і на іх атачэнне. Цэласны культурны ландшафт можа ўключаць гарады або нават рэгіёны. І гэты комплексны падыход мае зусім іншую філасофію...

Таму тэма будаўніцтва шматпавярховага гатэля ў гістарычнай частцы Нясвіжа актыўна абмяркоўвалася ў кулуарах. Зрэшты, да праблем знакамітага Кернакскага храма ў Егіпце, усутыч з якім ужо вырас элітны жылы масіў, нам яшчэ, на шчасце, далёка...

Ахвотных знесці тыя высоткі, што з'явіліся на тэрыторыі гістарычнага цэнтра Мінска (які, на жаль, выпадае лічыць *страчаным* помнікам горадабудаўніцтва), можна фарміраваць у цэлыя інтэрнэт-батальёны. І амаль кожны з гэтых пасіянарыяў рэгулярна бывае ў Вільнюсе, дзе гістарычны цэнтр напоўніцу захаваўся і, да таго ж, унесены ў Спіс UNESCO. Але ж праблем там таксама не бракуе.



ф о т а ф а к т

Паясы з Варшавы

У рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння слуцкіх паясоў у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь з 5 лістапада прадстаўлены шэсць паясоў з калекцыі Нацыянальнага музея ў польскай сталіцы. Пяць паясоў створаны знакамітай мануфактурай Маджарскіх у перыяд іх кіравання (1767 — 1807 гг.), адзін — пасля 1807 года.

КУЛЬТУРА ШТОТЫДНЁВАЯ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ.
Адказны сакратар: Вольга НАВІЦКАЯ; **рэдактары аддзелаў:** Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Аліна САЎЧАНКА; **загадчык аддзела фотаілюстрацый** — Юрый ІВАНОЎ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Інга ЗЕЛЬГІС.
Сайт: **www.kimpress.by** E-mail: **kultura@tut.by**
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва" 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Прыёмная: (017) 290 22 50. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2014. Наклад 5928. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 06.11.2014 у 16.30. Замова 4448.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Зваротная сувязь: рэплікі і каментарыі

Погляд на трывогі сучаснасці

Наталля ШАРАНГОВІЧ, кіраўнік Цэнтра сучасных мастацтваў, камісар Нацыянальнага павільёна Рэспублікі Беларусь на 56-м Венецыянскім біенале:

— Пасля невялічкага перапынку наша краіна вяртаецца на Венецыянскі біенале. Налета найбуйнейшая ў свеце выстаўка сучаснага мастацтва займее Нацыянальны павільён Рэспублікі Беларусь. А першым крокам да яго стварэння стаў конкурс куратарскіх канцэпцый, аб'яўлены 5 лістапада.

Механіз адбору мае быць максімальна дэмакратычным. У склад журы, якое ўзначаліла першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга, увайшлі досыць разнапланавыя і аўтарытэтныя асобы: вядомыя куратары і мастацтвазнаўцы, кіраўнікі музейных устаноў і творчых саюзаў.

Чаго мы чакаем ад удзельнікаў конкурсу, дык гэта нейкай смелай крэатыўнай ідэі. Уласна, Венецыянскі біенале і з'яўляецца спаборніцтвам такіх ідэй, ва ўвасабленні якіх задзейнічаны найсучасныя тэхналогіі. Спадзяюся, беларускі праект таксама атрымаецца сучасным паводле сваёй канцэпцыі ды выяўленчых сродкаў. Балазе прапанаваная тэма дае вялікую прастору для творчага пераасэнсавання.

Дэвіз наступнага, 56-га Біенале даслоўна перакладаецца як "Усе лёсы свету". Яго куратар нігерыец Акуі Энвайзор засяродзіў увагу на няпэўнасці будучыні і, адпаведна, на невычэрпным патэнцыяле цяперашчыны, ды таму задаецца пытаннем: "Як правільна вытлумачыць трывогу, уласцівую нашаму часу, як яе зразумець, даследаваць ды артыкуляваць?".

Ужо вядома, што Нацыянальны павільён Рэспублікі Беларусь адкрыецца ў прамежку з 6 па 8 мая. А вось яго адрас на карце Венецыі пакуль не вызначаны. І таму ад удзельнікаў куратарскага конкурсу патрабуецца не толькі пералік мастакоў, але і тэхнічныя параметры ды прыблізны каштарыс рэалізацыі задумы.

Прыём заявак адбываецца да 24 лістапада, а вынікі конкурсу маюць быць абвешчаны напрыканцы месяца. Між іншым, пераможцаў чакаюць немалыя прэміі, хаця не апошняя з іх — гэта, вядома, магчымасць рэалізаваць уласную задуму ў рамках галоўнай мастацкай падзеі свету.

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby, odnoklassniki.ru/group/52156879339702**

У рамках **Дзён культуры Беларусі ў В'етнаме** адкрылася выстаўка беларускіх мастакоў, а таксама падпісана Праграма супрацоўніцтва.

ці дэзерціры?

Скажы, што думаеш пра кансервацыю, і я скажу, хто ты…

І справа не ў тых новых прыступках, што вядуць да слыннай Маці Божай Вострабрамскай, якія ўжо сталі нагодай для цэлага скандалу. І нават не ў тым, што пасля доўгага сузірання абраза "вочы ў вочы" ты рызыкуеш убачыць сцяну з сілікатнай цэглы: нехта з гаспадароў суседніх будынкаў употайкі сябе "падрамонціў", не чакаючы муніцыпалітэта. Справа ў тым, што літаральна адтуль, з Вострабрамскай, адкрываецца відавая перспектыва на іншы Вільнюс — высотныя вежы "Сіці".

— На жаль, у цяперашні час рэй вядуць не тыя людзі, якія шануюць культуру ды гісторыю, але прыхільнікі іншых каштоўнасцей, — адзначыў літоўскі архітэктар Аўгіс Гучас.

Здавалася б, праблему прадугледжаных рэкамендацыямі UNESCO буферных зон у дадзеным выпадку вырашыла сама гісторыя. Стары цэнтр Вільнюса атачаюць сфарміраваныя стагоддзі таму прадмесці: Зарэчча, Звярынец, Шніпішкі... У апошнім з іх высотнае будаўніцтва распачалося яшчэ за савецкім часам, але знакамітыя "еўропы" з'явіліся ўжо менавіта ў пару незалежнасці... Адпаведна, пошукі пэўнага ўрбаністычнага кампрамісу паміж захаваннем спадчыны ды сучасным развіццём буйных гарадоў актуальныя не толькі ў нас. І відавочна, што прадуктыўным вынікам можа быць менавіта кампраміс, а не перацягванне коўдры ў той або іншы бок.

Згаданы інтэграцыйны падыход прадугледжвае сацыяльны фактар. UNESCO, якая ўжо не першы год вызначае ідэйныя трэнды ў справе аховы спадчыны, у дадзеным выпадку безапеляцыйна сцвярджае: помнік нельга разглядаць як нейкую "рэч у сабе". Па вялікім рахунку, ён павінен стаць нагодай для нейкіх грунтоўных сацыяльных камунікацый. У нас пакуль што ў гэтай справе — "твая мая не панымаць". Адрэстаўравала дзяржава Мірскі замак, а "грамадскасць" сказала: не тое, не так, дый увогуле, лепш бы не чапалі…

Пра апошні варыянт яшчэ ў 1949 годзе вельмі добра выказаўся легендарны савецкі рэстаўратар Павел Бараноўскі: "Прадаставіць руіны архітэктурных помнікаў самім сабе азначае для іх абсалютную гібель". А вось характар умяшальніцтва акурат і выклікае палымяныя дыскусіі. Пагатоў, не так даўно ў айчынным ужытку з'явілася малазнаёмае пакуль слова "кансервацыя". Яго вельмі любяць спецыялісты ў справе аховы спадчыны з усяго свету — прыкладам, у лексіконе польскай мовы наогул няма паняцця "рэстаўрацыя", чаго, аднак, не скажаш пра рэчаіснасць.

У гэтым кантэксце даклад Дзмітрыя Бубноўскага стаў сапраўднай інтэлектуальнай правакацыяй. Галоўны архітэктар і навуковы кіраўнік рэстаўрацыі таго самага Мірскага замка, у якога свой вербальны дроцік не кінуў хіба толькі лянівы, нарэшце падаў голас (зрэшты, раней ніхто з крытыкаў і не пытаўся, што ён там думае). Даклад выглядаў пераканаўча: з цытатамі Гётэ, развагамі пра марнасць быцця і эпітэтамі кшталту "дэзерцір-некрафіл".

Асноўны пастулат заключаецца ў тым, што кансервацыя ў кожным разе не дасягае пастаўленай мэты — поўнага спынення руйнавальных для помніка хімічных і біялагічных працэсаў, — а пры памылковым выкананні работ нават прыводзіць да згубных вынікаў. Прышчэпленыя да вапнавай кладкі бетонныя каронкі могуць адрывацца разам з аўтэнтычным матэрыялам. Часовыя дахавыя пакрыцці маюць схільнасць гніць, спараджаючы біялагічныя забруджванні, бо застой паветра вельмі любяць разнастайныя мікраарганізмы...

— У Мірскім замку мы з гэтым сутыкнуліся, і спатрэбілася шмат часу, сіл і сродкаў для таго, каб ліквідаваць наступствы, якія ўзніклі ад выкарыстання такой методыкі, — патлумачыў Дзмітрый Бубноўскі.

Праўда, ён не ўдакладніў, колькі ж часу праіснавалі тыя "часовыя" канструкцыі перад тым, як яны струхлелі. Бо, як падказвае тутэйшая практыка, мяжа паміж часовым і вечным можа быць даволі ўмоўнай, а розныя мікраарганізмы нярэдка апярэджваюць людзей.

У якасці альтэрнатывы рэстаўрацыі дакладчык прапанаваў пакрыць Мірскі замак бетонным саркафагам альбо шкляным конусам. Варыянты былі абраны заведама пройгрышныя параўнальна з выкананымі ў рэчаіснасці работамі.

— Магчыма, вы маглі палічыць мяне праціўнікам кансервацыі. Ды ні ў якім выпадку! Лічу кансервацыю адным з краевугольных камянёў нашай рэстаўрацыйнай практыкі і аховы спадчыны. Я параўнаў бы яе значэнне са значэннем нуля ў арабскай сістэме лічэння: сама па сабе гэтая лічба азначае пустэчу, але калі дапасаваць да яе нейкую іншую... Тое ж самае датычыцца і кансервацыі: толькі гэтымі тэхнічнымі сродкамі праблему не вырашыць, але ў комплексе з іншымі вынік можа быць цалкам пераканаўчым…

Слухаючы гэты даклад, я думаў нават не пра тыя "трывалыя руіны", у якія ператварылася большасць "безнадзейных" у плане рэстаўрацыі ды прыстасавання помнікаў суседняй Польшчы, не пра спрэчныя вынікі кансервацыі Навагрудскага замка, і нават не пра тое, што ідэальных спосабаў захавання спадчыны, пэўна, не існуе, і таму варта аддаваць перавагу рэальным. Падумалася мне пра тое, што няма ў нас пляцоўкі, дзе зацікаўленыя людзі маглі б абмеркаваць злабадзённыя праблемы галіны, выслухаць думку апанента, удосталь надыскутавацца. На жаль, семінары для спецыялістаў запаўняюць лакуну часткова. К

Увага! Аб'ява!*

Государственное учреждение образования "Институт культуры Беларуси"

объявляет конкурс на замещение вакантной должности

профессора кафедры культурологии и психолого-педагогических дисциплин.

Полная информация о документах для участия в конкурсе размещена на web-сайте института http://inbelkult.by.

Срок подачи заявлений на конкурс — один месяц со дня опубликования объявления.

Дополнительную информацию можно получить в отделе правовой, кадровой работы и делопроизводства по телефону: (017) 263-30-58.

Зваротная сувязь: рэплікі і каментарыі

Колькі слоў пра бібліятэкараў

Ніна ТУРОЎСКАЯ,
былы бібліятэкар:

— Прыемна чытаць на старонках "К" артыкулы аб дзейнасці бібліятэк! Таксама хочацца падзякаваць праз газету начальніку аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Валожынскага райвыканкама Вікенцію Адамовічу, які прыязна ставіцца да гэтых устаноў. Мы з ім згодныя ў меркаванні, што трэба разумна падыходзіць да рэарганізацыі клубаў і бібліятэк. Сапраўды, скасаваць лягчэй, чым наладзіць працу па-новаму...

Вельмі хочацца, каб пры ўсіх аптымізацыйных працэсах улічвалася праца кожнага бібліятэкара індывідуальна. Зразумела, сучасным патрабаванням адпавядае не любы, але ж за зарплату, што маем у дадзенай сферы, дзе знойдзеш лепшыя кадры?

Я 40 гадоў працавала ў бібліятэках, і выдатна разумею, што працаваць за такія грошы, маючы добрую прафесійную падрыхтоўку, — крыўдна. А матэрыяльна-тэхнічная база некаторых бібліятэк не заўсёды адпавядае нават санітарна-гігіенічным патрабаванням. Але спецыялісты, прынамсі, большая іх частка, не лічацца з рэжымам сваёй працы і прыходзяць па першым званку раённага кіраўніцтва ў сваю ўстанову.

Сельскі бібліятэкар павінен не толькі быць добрым прафесіяналам сваёй справы. За апошні час кола яго абавязкаў значна пашырылася. Калі бібліятэкар умее добра напісаць ці распавесці пра сваю працу, спявае, танчыць, чытае вершы, можа стварыць сцэнарый, добра валодае камп'ютарнымі тэхналогіямі, здольны рэжысіраваць мерапрыемствы і супрацоўнічаць з разнастайнымі ўстановамі, тады яго лічаць прафесіяналам. А тое, што бібліятэкар добра валодае інфармацыяй па розных пытаннях, — не заўсёды ацэньваецца.

На мой погляд, патрэба ў сапраўдных прафесіяналах ставіць перад навучальнымі ўстановамі, якія рыхтуюць бібліятэчныя кадры, новыя задачы: трэба змяняць падыходы да падрыхтоўкі… Зрабіць сапраўдных прафесіяналаў, што адпавядаюць сучасным патрабаванням, не так і лёгка, але калі іхняя праца будзе ацэньвацца, у тым ліку і ў годным фінансавым вымярэнні, знойдуцца і кадры. Хочацца, каб звярнулі ўвагу і на матэрыяльна-тэхнічны стан сельскіх бібліятэк.

А наогул, шчыра жадаю ўсім культработнікам моцнага здароўя, плённай працы, творчага натхнення!

Фотасюжэт нумара

Кадр з фільма "Пан Тадэвуш".

"Мірскі замак у кіно"

Сёння ў сталічным кінатэатры "Перамога" адкрываецца выстаўка пад такой назвай. На ёй будуць прадэманстраваны кадры з фільмаў, месцамі здымак якіх станавіліся перліны беларускага дойлідства. А пасля вернісажу ў рамках фестывалю "Лістапад" адбудзецца паказ адной з такіх стужак — польскай карціны "Пан Тадэвуш" 1928 года.

Кадр з фільма "Пані Марыя".

Кадр з фільма "Снайпер".

Кадр з фільма "Ярмолавы".

Кадр з фільма "Усходні калідор".

У люстэрку вады: кадр з фільма "Праз могілкі".



Кадр з фільма "Тры вясёлыя змены".

Чытка п'есы Аляксандра Мантуша **"Песня імігранта"** прайшла на гэтым тыдні на Малой сцэне Тэатра беларускай драматургіі.

Дзяжурны па нумары

У палац — з квітанцыяй?

Хацелася б пачаць з нібыта рытарычнага пытання: што трэба жыхару Беларусі, каб вольна падарожнічаць па сваёй краіне? Здавалася б, дастаткова толькі жадання. Калі яно ёсць, тады і фінансавы аспект не такі ўжо і важкі: заўсёды можна дабрацца да той або іншай гістарычнай славутасці калі не на сваёй машыне ці аўтобусе, то на папутцы. На жаль, насамрэч не ўсё так проста.

Кастусь АНТАНОВІЧ

Адразу выключаем са спісу патэнцыйнага наведвання турыстамі помнікі архітэктуры, якія сёння з'яўляюцца рэжымнымі аб'ектамі, — скажам, старадаўнюю сядзібу ў Жодзішках, што на Смаргоншчыне, у якой цяпер размешчаны псіхіятрычны шпіталь. Да радасці падарожнікаў, такіх аб'ектаў па ўсёй Беларусі не так ужо і шмат, чаго не скажаш пра славутасці роднага краю, размешчаныя непадалёк ад дзяржаўнай мяжы. Можна ўзгадаць шэраг старадаўніх касцёлаў ды цэркваў, палацаў і сядзіб, помнікаў прыроды, якія размешчаны ў так званай памежнай зоне — на тэрыторыі, дзе жывуць і працуюць дзясяткі тысяч чалавек, але разам з тым там дзейнічаюць пэўныя абмежаванні доступу. Да слова, за парушэнне памежнага рэжыму турыст можа атрымаць папярэджанне або нават штраф да 20 базавых велічынь.

Трэба сказаць, што да 2009 года, каб завітаць на тэрыторыю памежнай зоны, патрэбна было асабіста звяртацца ў мясцовыя аддзелы ўнутраных спраў і дакументальна даказваць сваю сувязь з размешчанымі там населенымі пунктамі. Цяпер перад такім падарожжам дастаткова наведаць любое аддзяленне "Беларусбанка", захапіўшы з сабой пашпарт, і аплаціць дзяржпошліну ў памеры 0,2 базавай велічыні (якая дзейнічае цягам года). Акрамя таго, рэкамендуецца за 24 гадзіны да запланаванага наведання памежнай зоны патэлефанаваць у адпаведны тэрытарыяльны орган памежнай службы, каб паведаміць пра свой візіт.

Здавалася б, не такія ўжо і складаныя працэдуры. Але, па-першае, яны не датычацца замежных турыстаў. Грамадзянам іншых краін, як і раней, трэба мець з сабой пропуск, для атрымання якога неабходна звярнуцца да ўпаўнаважаных службовых асоб тэрытарыяльных органаў памежнай службы з заявай. Тэрмін выдачы такіх прапускоў — пяць дзён. Наколькі гэта зручна чалавеку, які прыехаў у Беларусь усяго на пару сутак?

Па-другое, здзівіла свежая інфармацыя, якая абляцела айчынныя інфармагенцтвы. Так, па ініцыятыве органаў памежнай службы рашэннем абласных выканкамаў рэгламентаваны змены межаў памежнай зоны і паласы ўздоўж дзяржаўнай мяжы. Яны абгрунтаваны мэтай выключэння са спісу памежнай зоны населеных пунктаў, дзе размяшчаюцца турыстычныя цікавосткі: установы і аб'екты культуры, санаторыі, месцы масавага адпачынку… Не паленаваўся і падрабязна пазнаёміўся з новымі спісамі. Вось толькі вялікіх змяненняў я там не заўважыў. Больш за тое: тыя вёсачкі, што маглі б стаць хай сабе і невялікімі турыстычнымі меккамі, як былі "памежнымі", так і засталіся. Да прыкладу, на Гродзеншчыне памежная зона перарывае цудоўны маршрут, які праходзіць з Гальшанаў праз колішняе мястэчка Трабы з ягонымі старадаўнімі храмамі, славутую сядзібу ў Жамыслаўлі. Так што пра развіццё агратурызму ў гэтых ды многіх іншых вёсках з адпаведным статусам няма і гаворкі.

Зразумела, ахова дзяржаўнай мяжы — справа ва ўсіх адносінах вельмі важная. Іншая справа, што было б добра, каб усе тыя плацяжы ды дазволы можна было атрымаць не выходзячы з дому — праз Інтэрнэт. Усё ж патрэбна лібералізаваць у большай ступені некаторыя пункты Палажэння аб памежнай зоне, каб дазволіць праязджаючым транзітам турыстам хаця б на некалькі гадзін спыніцца ля таго або іншага аб'екта культуры без лішку дазвольных дакументаў.

Пакуль жа турыстам варта быць пільнымі ды звяртаць увагу на прыдарожныя знакі, якія абмяжоўваюць не толькі хуткасць руху, але і знаходжанне на пэўнай тэрыторыі.

Non fiction

"Па ходу, "крэйда"

Адгадаць, а не прыгадаць, або "Валера, это позор!"

Як пяецца ў адной вядомай сучаснай песні, "галоўнае — не што, а як". Пра гэтую зусім не новую ісціну мне падумалася, калі суботнім вечарам у айчынным шоу "100 мільёнаў" на канале Агульнанацыянальнага тэлебачання двое маладога веку мужчын хаатычна перакладалі тоўстыя пачкі з грашовымі знакамі са стойкі на стойку. Яны спрабавалі адгадаць, якое ж слова рускай мовы абазначае беларускае "крэйда" (так, менавіта адгадаць, а не прыгадаць). Варыянты адказаў: "стол", "карандаш", "мел", "фломастер". Вам патрэбна хвіліна на роздум?

Сяргей ТРАФІЛАЎ

Для мяне, як і для большасці беларусаў, не стане адкрыццём: інтэнсіўна паварушыць звілінамі для адказу давядзецца многім. На жаль, такія маем рэаліі валодання азамі беларускай мовы з савецкіх часоў. А слова "крэйда" не менш як дзевяць, а то і адзінаццаць гадоў запар даводзіцца чуць на школьных уроках беларускай мовы. Вядома, гаворка ідзе пра "мел". Хлопцы, дарэчы, дайшлі да правільнага варыянту (спачатку быў "фломастер") толькі пасля таго, як скарысталі падказку. А яна была задзейнічана ўжо тады, калі вядучы проста ў кадры схапіўся за галаву (а адзін з удзельнікаў так і сказаў пасля збянтэжаных пошукаў варыянту адказу: "Валера, это позор!..")...

Чаму ж так адбываецца, калі словы, выразы, цытаты па-беларуску, вядомыя са школы, літаральна за год-другі пасля яе заканчэння трывала вылятаюць з галоў? А пра чытанне кніг на роднай мове (колькі разоў цягам апошніх месяцаў даводзілася пісаць на старонках "К" на такую тэму!) і казаць не стану. "Навошта чытаць іх, як і чытаць наогул?" — усё часцей сутыкаемся з падобнага кшталту пазіцыяй сучасніка-беларуса.

Прычын становішча мне бачыцца некалькі (вось і спатрэбілася педагагічна-філалагічная палова ў назве маёй спецыяльнасці па дыпломе). Уласна, стаўленне да ўрокаў беларускай мовы ды літаратуры ў школе як з боку вучняў, так і іх бацькоў ды настаўнікаў, запатрабаванасць гэтых ведаў у далейшым, а таксама, скажам так, месца дадзеных заняткаў у раскладзе ўрокаў.

Што да апошняга пункта, дык заняткаў сапраўды мала. Матэрыял (калі няма дабраахвотна-абавязковых дадатковых гадзін) даецца не проста павярхоўна. І, калі шчыра, нават не паводле знакамітага прынцыпу "галопам па еўропах". Таму натуральнае і выказанае Прэзідэнтам Беларусі патрабаванне аб павелічэнні колькасці гадзін на выкладанне гэтага кірунку.

Запатрабаванасць? Але яе (за выключэннем тых, хто судатыкаецца з роднай мовай па прафесійных абавязках ці па закліку душы) практычна і няма. Апроч хіба такіх вось "форс-мажорных" пытанняў у віктарынах для вясёлых і кемлівых. Ну, часам дзіцяці нешта патлумачыць па школьных заданнях у меру абазнанасці. Адпаведнае і стаўленне вучняў, бацькоў, настаўнікаў. А ўсё названае агулам — паняцце прэстыжу, ці не так?

У кірунку ж дэкларавання яго, прэстыжу, павышэння радуюць выказванні высокіх чыноўнікаў пра магчымасць вяртання абавязковага экзамену па роднай мове за курс школы. А таксама, мяркую, цалкам слушныя развагі пра тое, што той самы чыноўнік проста павінен валодаць абедзвюма дзяржаўнымі мовамі паўнавартасна.

Цяпер жа пару слоў пра тое, што, на маю думку, не радуе, а, хутчэй, пакідае (выкажуся ў гранічна мяккай форме) у збянтэжанасці патрыятычнага чалавека, а таксама пра тое, чым, на жаль, актыўна падмяняецца сама тэза пра павышэнне прэстыжу беларускай мовы ў беларускім жа грамадстве. Зноў той жа канал "АНТ", праграма "Я люблю Беларусь!", нядзельны прайм-тайм. (Ну, пра тое, што Беларусь любяць не на роднай мове, казаць не стану. Як чалавеку, што працуе ў прасторы медыя, мне, асабліва з улікам таго самага прайма ды згаданых на пачатку артыкула рэалій, тут усё зразумела. Хоць аптымізм і той самы патрыятызм дазваляюць падумаць над варыянтамі. Скажам, ва Украіне ў шэрагу праграм закадравы голас і цітры могуць ісці на ўкраінскай мове, а вядучы — размаўляць на рускай; яшчэ варыянт — двое вядучых, кожны з якіх працуе на адной з моў. У выніку — усе задаволены.) Найбольш, паўтаруся, мякка кажучы, здзіўляе рубрыка гэтай праграмы, дзе паспяховыя асобы (у межах мясцовай прасторы) са смешачкамі спрабуюць па літарах узнавіць беларускае слова. Столькі шчырага смеху выклікае сама каструбаватасць, з якой нашы "зоркі" спрабуюць "пабудаваць" тое слова. Нярэдка, бачачы разгубленыя вочы "стараў", — абсалютна ім невядомае. Бо па-беларуску не гавораць, не пішуць, не спяваюць. Карацей, пароль усё той жа: "крэйда".

Чаму ж так адбываецца, **калі словы, выразы, цытаты па-беларуску, вядомыя са школы, літаральна за год-другі пасля яе заканчэння трывала вылятаюць з галоў?** А пра чытанне кніг на роднай мове (колькі разоў цягам апошніх месяцаў даводзілася пісаць на старонках "К" на такую тэму!) і казаць не стану.

Так, радуе, што смяяцца над сабой "зоркі" не развучыліся, але наўрад ці правал — а як інакш назваць? — на тым або іншым беларускім слове (чым не доказ, што "як чуецца, так і пішацца" — не аксіёма роднай мовы) у агульнанацыянальным эфіры стане нагодай пашырыць свае веды ў беларускасці. І сорамна не будзе ім. Чаму? Зноўку гаворка мусіць ісці аб прэстыжы ды аб праславутым "навошта?".

Наогул, памыліцца — не складана. Асабліва ўлічваючы тое, што дакладным вымаўленнем, скажам, айчынныя спевакі, якія выконваюць песні на вершы беларускамоўных паэтаў ды творы нацыянальнага фальклору, не асабліва пераймаюцца. (Урэшце, крытыка ім "да лямпачкі": яны ж — самі з вусамі, прадзюсарскія праекты, ага!) Напісана ж, што "рэчанька-рэчанька" — "не поўная… не роўная", дык навошта згодна з арфаэпіяй прапяваць "ня поўная… ня роўная"? А беларускамоўная "песня" без "сьн" у вымаўленні — зусім і не наша. Дарэчы, вельмі здзівіўся, пачуўшы, як вядомы айчынны ансамбль дасканала артыкуляваў у творы слова "нарэшце" як "нарэсьце"…

Але вернемся да прэстыжу мовы. Вось "Я люблю Беларусь!" задумана, каб спрыяць яго павышэнню (у ліку павышэння прэстыжу ўсяго беларускага). І знаходжанне дадзенай праграмы менавіта ў такім выглядзе ды яшчэ і ў прайм-тайм нацыянальнага канала мусіць працаваць на гэта: папулярны лікбез, калі жадаеце. А што яшчэ існуе ў гэткім жа кірунку на айчынным ТБ? Хвілінкі пра мову на "Беларусь 3"? Калі шчыра, разлічаны яны на тых, хто больш-менш у моўнай стыхіі, а яшчэ ў гэтых карацельках — пафасны налёт дыдактызму-акадэмізму. Як і не надта сучасным падаецца фармат віктарыны на тым жа канале, які нагадвае, хутчэй, школьны адкрыты ўрок. Што да мяне, дык я б пераключыў канал, каб часам не глядзеў больш з прафесійнага пункта гледжання такія перадачы. Яшчэ існуе аналагічная хвілінка ў ранішнім эфіры "АНТ". На гэтым пералік амаль завяршаецца: астатнія праграмы ідуць ці па-беларуску, ці — па-руску. Без асаблівых варыянтаў і мэт у кірунку выкладзеных думак. Так што ад названага "масіву", які мусіў бы працаваць на карысць пашырэння беларускай мовы, вынік атрымліваем фармальны. На жаль, спрацоўвае "галоўнае — не што, а як".

Ну, і, відаць, для паралелі варта згадаць пра тое, што якраз-такі не фармальнае, але — вузка-арыентаванае, прычым на тых, хто да мовы ставіцца, прынамсі, прыязна. І вынік праз гэта — таксама адносны. Вось, стварылі праграму для планшэтаў ды смартфонаў "Слова дня". Лексемы там і сапраўды далёка не ўсе вядомыя нават кожнаму другому. Але аўдыторыя — не масавая ў маштабе рэспублікі. А ёсць яшчэ серыя магнітаў на халадзільнік з дасціпнымі малюнкамі, што дазваляюць запомніць пэўныя фігуры мовы. Скажам, на тым, дзе абыгрываецца выраз "Ехаць на тралейбусе", дзяўчына сядзіць на гэтым самым транспартным сродку. Дадамо сюды і папулярныя курсы "Мова нанова", якія праз сваю забаўляльную форму збіраюць сотні чалавек у розных гарадах. Карацей, форма — цікавая, вынік — станоўчы, але масавасць — адносная. У выпадку з ТБ, масавасць таксама адносная — праз тое, што форма кульгае, як і вынік услед за ёй.

Відавочна, што намаганні ўсіх зацікаўленых суб'ектаў працэсу павышэння прэстыжу беларускай мовы патрабуюць аб'яднання, "мазгавога штурму" і атрымання сінтэтычнай цікавай формы падачы беларускай мовы як сродку камунікацыі максімальна масавай аўдыторыі. Гаворка тут, безумоўна, — пра тэлебачанне (нават не пра Інтэрнэт, бо гэта пакуль яшчэ прынцыпова розныя мэтавыя аўдыторыі; урэшце, у свеце ўсё так вокамгненна змяняецца…). І пра школу, дзе без такога моднага цяпер інтэрактыву ў найсучасных спосабах ды адаптавана для дзяцей і падлеткаў, відаць, не абысціся. Чаму? Бо так веды элементарна зафіксуюцца, застаючыся з чалавекам. Для гэтага сапраўды патрэбны дадатковыя гадзіны, разуменне неабходнасці (без таго самага "навошта?") валодання беларускай мовай для вучняў ды іх бацькоў, зацікаўленасць настаўнікаў. Ну, і прыгадаем паўтораныя неаднойчы апошнім часам Прэзідэнтам словы, што без мовы няма народа.

А веды, пры выпадку, несумненна, будуць скарыстаны. Без форс-мажораў у духу апісанай мной "крэйды".

ф о т а ф а к т

У майстэрні Шчамялёва

Чарговая сустрэча ў рамках рубрыкі "Рэдакцыя плюс..." адбылася з народным мастаком Беларусі Леанідам Дзмітрыевічам Шчамялёвым у ягонай майстэрні. Што сказаў майстар пра час, краіну, прызначэнне мастака і ўласныя прыхільнасці ў творчасці, чытайце ў наступных нумарах "К".

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Беларускія дакументальныя і анімацыйныя фільмы плануецца **прадэманстраваць у Егіпце**.

З чым "ядуць" беларускі медыеваль?

Як мне падаецца, чалавек пачынае граць тую музыку, якой яму ў жыцці не хапае. Патрэба ствараць музычны твор нараджаецца тады, калі сярод існай навакольнай музычнай культуры адсутнічае тое, што хацелася б слухаць. Калі б у 1997 — 1998 гадах узнік гурт, падобны да "Старога Ольсы", я стаў бы ягоным фанам, ездзіў бы на яго канцэрты, працягваў надалей калекцыянаваць старыя інструменты, і нават не задумваўся б пра ўласную канцэртную практыку…

ТЭКСТ

Зміцер САСНОЎСКІ,
лідар гурта "Стары Ольса"

У пачатку 1990-х на Беларусі сярэднявечнай музыкі многім не хапала. Гуртоў стылю медыеваль (Сярэднявечча) проста не існавала. Рыцарскія клубы, турніры, першыя тэатральныя пастаноўкі на такія тэмы, фестывалі фальклорнай музыкі — да сярэднявечнай музыкі моцна цягнула, але яна не была даступнай. Часткова ратавалі замежныя выканаўцы (немцы, французы, шведы, чэхі), але яны неслі ў сваёй музыцы крыху іншыя, і таму чужыя эмоцыі. А вельмі хацелася, не выключаючы агульнаеўрапейскае, атрымаць нешта пачуццёва сваё — у манеры ігры, аранжыроўках, інструментах, рэпертуары, у мове, нарэшце!

А яшчэ моцна абурала жорсткае абмежаванне жанраў. І тое, што далятала з Еўропы, і тыя першыя крокі, якія рабілі айчынныя музыканты, — усё выразна падзялялася па паходжанні: камерна-палацавая музыка, гарадскі танцавальны пласт, духоўная музыка, рыцарскі эпас, старадаўні фальклор і, нарэшце, незабыўнае фэнтазі на тэму Сярэднявечча. "Кантабіле" выконвалі барока — "Полацкі сшытак", гурт "Камелот" сачыняў стылізаваныя песні на сярэднявечныя тэмы, "Ліцвіны" знаёмілі з архаічным фальклорам. І ўсё. У тыя гады не знаходзілася ні ў нас, ні ў Еўропе гурта, які пачаў бы смела складаць у адну канцэртную праграму спадчыну розных пластоў грамадства: магнатаў, рыцараў, духавенства, гараджан і сялян. А іхнія культуры актыўна варыліся ў адзіным рознасацыяльным і рознаэтнічным катле, які з сябе ўяўляў сярэднявечны горад.

У беларускім медыевалі музыканты **часта граюць тое, што танцоры не адрэстаўравалі,** а танцоры здолелі зрабіць рэканструкцыю танцаў, якіх музыканты яшчэ не развучылі.

Але пакрысе пачалі працаваць майстры па вырабе ліраў, дудаў, лютняў. Пазней з'явіліся майстры, што стваралі гуслі. Я асабіста перакананы, што беларускі медыеваль пачынаў сваё жыццё ад захаплення старадаўнімі інструментамі. На іх гралі, іх гукамі захапляліся, рабілі першыя кволыя спробы спалучаць інструменты між сабой. І толькі потым пакрысе ўзнікла патрэба пошуку рэпертуару. Недасведчанасць ва ўласнай музычнай гісторыі выліваласяў шматлікія стылізацыі. Пасля пачалося засваенне агульнаеўрапейскага рэпертуару — папулярных у краінах Еўропы старадаўніх танцаў. Потым — пошукі свайго старадаўняга фальклору. І ў апошнюю чаргу пачалі звяртацца да ўласных рэнесансавых кампазітараў, "Віленская сшытка", "Полацкага сшытка", лютневай спадчыны… Гэта быў стыхійны і непадкантрольны працэс. Нейкая наканаванасць, што была непадуладная нам, але адпавядала нашым памкненням.

Беларускі медыеваль прайшоў некалькі этапаў стылістычнага стаўлення: інструментальныя доследы, стылізацыя-фэнтазі, агульнаеўрапейская спадчына, фальклорная архаіка, уласная спадчына. Зараз гэта — аўтарытэтны і шматлюдны рух, пра які ведаюць у многіх краінах, а тыя, хто не ведае, вельмі здзіўляюцца пры першым знаёмстве. І мы заслужылі гэтае стаўленне. У Беларусі шмат таленавітых людзей доўгі час рабілі нямала намаганняў па вяртанні ды засваенні сярэднявечнай музыкі. Мы аднавілі шмат забытых інструментаў, вярнулі да жыцця многія страчаныя і замоўклыя творы. Вельмі радуе супрацоўніцтва паміж музыкамі і гуртамі. Радуе ўвага да рэнесансавай ды барочнай спадчыны акадэмічных музыкантаў і даследчыкаў.

Але, вядома, ёсць і праблемы. Адсутнічае супрацоўніцтва паміж музыкантамі, з аднаго боку, і танцорамі — з іншага. Утварыўся вялізны дысбаланс паміж харэаграфічнай спадчынай, якую аднавілі танцавальныя тэатры, і рэстаўраваным музычным рэпертуарам. Музыканты часта граюць тое, што танцоры не адрэстаўравалі, а танцоры здолелі зрабіць рэканструкцыю танцаў, якіх музыканты яшчэ не развучылі.

Другая праблема — у частковым супадзенні рэпертуару. Часам адну і тую ж кампазіцыю на адным канцэрце выконвае два ці тры гурты. Варта ўвесці прынцып, па якім засвоены рэпертуар не павінен супадаць у гуртоў. Гэта падштурхнула б да новых пошукаў. Дарэчы, у асабістых размовах многія музыканты пагаджаюцца з такім прынцыпам. І тут варта адзначыць добрую і кампанейскую прыязнасць між намі.

Маем выдатныя магчымасці, багацце талентаў, цікавасць удзячнай публікі (унутры краіны і за мяжой) і — самае галоўнае — велізарную музычную спадчыну, якая дазволіць яшчэ многім пакаленням праяўляць павагу да сваіх музычна адораных продкаў!..

Сацыяльныя сеткі і культура без скепсісу

Скажыце шчыра, ці змяняецца ваша стаўленне з нейтральнага на скептычнае, калі вы чуеце ў адной звязцы словы "сацыяльныя сеткі" і "культура"? Для мяне нейкай мяжы непрыняцця ў гэтым плане няма: я не пагаджуся, што масавасць альбо даступнасць такіх медыя зробяць культурнай прасторы "мядзведжую паслугу", пазбавіўшы яе налёту элітарнасці.

ТЭКСТ

Валерый ДАЙНЭКА,
заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь,
саліст ансамбля "Беларускія песняры"

З аднаго боку, сапраўды мусіць неяк напружваць пры праглядзе сваёй стужкі навін суседства галерэі рэпрадукцый работ Рэмбранта ці Маціса, выстаўленых у адной групе з нагоды ўгодкаў майстра пэндзля, і котак-папугаяў ды падобных мімімішных звяркоў з іншай суполкі. Але, нават прымаючы пад увагу большую запатрабаванасць шырокай аўдыторыяй апошняй з названых групы спасылак ды кантэнту, культурная інфармацыя не пралятае міма, а застаецца ў падкорцы і, пры патрэбе, ва ўсечанай форме, можа аднавіцца. Пры сваёй павярхоўнасці, кліпавасці, і такое знаёмства з культурай не акажацца лішнім. Так што фармальна няхай перад намі і сапраўды масавая (маскультурная) з'ява, але ад гэтага яна не перастае заставацца культурай.

Урэшце, масавасць сацыяльных сетак дазваляе мне быць заўжды ў курсе культурных падзей, планаваць свой графік, выбіраць з мноства імпрэз тыя, што мяне зацікавяць, часам — крыху пазайздросціць сябрам, якія змаглі выбрацца на падзею, што аказалася для мяне недаступнай (да прыкладу, мінскі канцэрт амерыканскага гітарнага віртуоза Лары Корыэла у Белдзяржфілармоніі супаў з канцэртамі "Беларускіх песняроў" у іншай краіне). А вось што раздражняе, дык гэта навязлівасць рэкламы, якая прэсінгуе цябе на кожным кроку. І ніякія настройкі прыватнасці акаунта тут, бадай, не ўратуюць на ўсе сто.

Сацыяльныя сеткі сталі цяпер шкалой вымярэння яшчэ адной культуры — культуры паводзін. Асабліва вострая рэакцыя сёння, вядома ж, на падзеі, звязаныя са становішчам на Украіне. Я не хачу аказацца ўцягнутым у нейкія палітычныя гульні праз заангажаванасць некаторых маіх фрэндаў па Сеціве ці рэальных знаёмцаў у падтрымку таго або іншага боку канфлікту. Даводзіцца нават наўпрост звяртацца да асабліва актыўных з настойлівай просьбай не ператвараць каментарыі да маіх спасылак (як правіла, нават і блізка не датычных да тэмы супрацьстаяння) у пляцоўку па распальванні нейкай варажнечы. Апошнім прыкладам стаў выпадак, калі я перапосціў даўжэзны тэкст пра тое, чым запомнілася наша дзяцінства і юнацтва ў СССР: асаблівая мода, марожанае ды газіроўка, нейкія прадметы побыту… У выніку, пад гэтым настальжы давялося праводзіць чыстку каментарыяў.

Адсюль і нюансы, звязаныя з адказнасцю не толькі артыста, але і любога ўладальніка сваёй публічнай старонкі за размешчаны на ёй кантэнт (згадаю тут расійскі закон аб прыраўнаванні асабліва чытаных блогераў да статусу сродкаў масавай інфармацыі). Так, я лепш буду на ёй коцікаў посціць, бо люблю жывёл, але не стану рабіць філіял інфармагенцтва.

Ну, і колькі слоў пра культуру зносін. Сацыяльныя сеткі размылі межы паміж артыстамі ды іх прыхільнікамі. Размылі, але — не змылі. Так, раней спевака можна было ў 99% выпадкаў сустрэць пад час яго канцэрта, а мастака — на вернісажы. Цяпер жа проста дадаць сваю сімпатыю ў сябры, падпісацца на абнаўленні, урэшце — напісаць асабістае паведамленне. Мне з падобнымі праявамі сутыкацца даводзілася, але, на шчасце, амаль без абвостраных выпадкаў, калі тымі ж электроннымі лістамі завальваюць. Ды ўсё ж празмерную актыўнасць сіх-тых фільтраваць даводзіцца.

Так што паняцці "культура" і "сацыяльныя сеткі" не ўзаемавыключальныя. Проста, змяняючы сродкі камунікацыі ды змяняючыся самі, мы фарміруем культурныя далягляды — больш адэкватныя часу.

Ці патрэбен супергерой для нашай сферы?

Ці патрэбны нам супергероі ў культуры? Скажам, у горадзе Мінску? А ў рэспубліцы наогул? Лепш без іх, бо цалкам дастаткова штодзённай дзейнасці, якая таксама прынясе свае вынікі? Проста, вынікі з'явяцца пазней, чым патрэбна, калі вада падточыць-такі камень. У такім выпадку я заўжды непакоюся пра тое, каб згаданае "пазней" не спазнілася настолькі, што і вынікі акажуцца марна страчаным часам.

ТЭКСТ

Надзея ІЛЬКЕВІЧ,
кіраўнік Цэнтра культурнага менеджменту

Вось з усіх гэтых прычын я і задумалася пра стварэнне "Школы супергерояў", што да 21 лістапада збірае заяўкі ад патэнцыйных удзельнікаў. Па вялікім рахунку, яе перспектыўная дзейнасць нават і не павінна абавязкова тычыцца менавіта культурнай дзялянкі — хутчэй, сацыякультурнай. Але, будзем шчырымі, тое, што атачае нас штодня ў грамадстве, і з'яўляецца прасторай культуры ў шырокім сэнсе.

Вынікам працы (а ў яе ўваходзіць навучанне на такіх курсах, як, да прыкладу, сацыякультурнае праектаванне, крэатыўныя індустрыі, маркетынг у сферы культуры, івент-менеджмент ды іншыя праекты) з 42 удзельнікамі стануць сем праектаў. Членам каманд давядзецца адпрацаваць іх "ад і да", у тым ліку праз прыцягненне мясцовай супольнасці — як прыватных асоб, так і ўстаноў — да рэалізацыі задумы, кантакты з уладнымі структурамі канкрэтнай адміністрацыйнай адзінкі сталіцы, задзейнічанне бізнесу. А яшчэ — фандрайзінг, мастацтва прэзентацыі ідэі. Як спецыялісту ў сферы культуры мне дакладна зразумела: такіх ведаў (а не проста бяздумнага карыстання тэрмінамі) сёння бракуе работнікам нашай галіны на розных узроўнях, асабліва тым, на каго ўскладзены менеджарскія задачы.

Так, гаворка ў гэтым, першым па ліку, праекце ідзе выключна пра абшары Мінска. Усё ж такі тут больш адпрацаваны схемы ўзаемадзеяння паміж ініцыятывамі рознага ўзроўню з тымі ж гарадскімі ўладамі (прыгадайце фестывальныя дзеі ў Грушаўцы ці Малінаўцы), большая канцэнтрацыя задум і асоб, экспертаў, што здольныя прыйсці на дапамогу парадамі, сваім досведам. Але праграмай максімум у найбліжэйшай перспектыве мне хацелася б бачыць рэалізацыю сацыякультурных ініцыятыў па-за МКАД.

У Мінску больш адпрацаваны **схемы ўзаемадзеяння паміж ініцыятывамі рознага ўзроўню з тымі ж гарадскімі ўладамі** (прыгадайце фестывальныя дзеі ў Грушаўцы ці Малінаўцы), большая канцэнтрацыя задум і асоб, экспертаў, што здольныя прыйсці на дапамогу парадамі, сваім досведам.

Яшчэ адна дэталь. Вельмі хацелася б, каб у поле ўвагі супергерояў трапілі і традыцыйныя ўстановы культуры са сваім крэатывам. Найперш тым, які тычыцца гарадской прасторы наогул. Уласна, я не бачу для гэтага ўзаемадзеяння ніякіх перашкод. Чаму б, скажам, бібліятэцы — не галаўной установе ЦБС, а філіялу ў мікрараёне — не выставіць для рэалізацыі ўласны праект? Работнікі кніжніцы атрымаюць, упэўнена, дэфіцытныя веды, а таксама магчымасць засвяціцца, прынамсі, у прасторы сваёй лакацыі. І да іх пойдуць людзі. Для пачатку, каб паглядзець на гэтых крэатыўных бібліятэкараў, а пасля… Дый ці варта казаць, як хутка добрае становіцца завядзёнкай.

Урэшце, нагадаю для тых работнікаў культуры, хто прытрымліваецца кансерватыўнай лініі: тыя ж даволі раскручаныя святы ў мікрараёнах (апроч двух згаданых, вядзецца праца яшчэ над некалькімі імпрэзамі такога кшталту ў іншых кутках сталіцы) зладзілі проста ініцыятыўныя людзі, не атрымліваючы загадаў "зверху". Але магу зразумець і скепсіс: а ці не стане падобнае праектаванне прычынай нейкага незадавальнення кіраўніцтва (маўляў, "схавацца ў бульбу" ды "залегчы на дно" прасцей)… Ды тут усё ж варта разумець сітуацыю ў культурнай прасторы і ўсведамляць пільную патрэбу апошняй у абнаўленні.

І яшчэ адзін момант. Сярод найважнейшых вынікаў "Школы супергерояў" я бачу менавіта наладжванне кантактаў паміж ахвочымі да крэатыўных задум гараджанамі ды мясцовымі органамі ўлады. Чаму? Бо нярэдка менавіта на гэтым узроўні ланцужок узаемадзеяння дае збой, тут існуюць застаялыя праявы інертнасці да такіх крэатыўных усплёскаў. Спадзяюся, адразу сем праектаў, датычных культурнай ці сацыякультурнай прасторы, паўплываюць на змены ў такім становішчы.

Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа 31 кастрычніка, 3 і 4 лістапада правёў імпрэзы XXIX "Каласавін".

Пра тых, хто "даязджае" — і застаецца

"Няхай будзе "Ленінкай": кансерватызм бібліятэкі — толькі ў назве

На пытанні "К" адказвае новы дырэктар Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У.І. Леніна Марына РАФЕЕВА. З ёй мы пазнаёміліся на II Міжнародным кангрэсе "Бібліятэка як феномен культуры". Марына Сяргееўна прыехала ў Мінск, каб распавесці калегам пра абласны конкурс прафесійнага майстэрства як спосаб творчай самарэалізацыі — дадатак да Рэспубліканскага спаборніцтва "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры"... Сустрэча ў кангрэсаўскіх кулуарах перарасла ў інтэрв'ю пра надзённы клопат установаў сферы на Гомельшчыне.

Яўген РАГІН

— Дырэктарам я — менш за месяц, — распавядае Марына Сяргееўна. — Яшчэ нядаўна была галоўным бібліятэкарам у аддзеле бібліятэказнаўства, займалася метадычнай работай. Таму і выступіла ў сталіцы з прамовай пра абласны прафесійны конкурс, якому — дваццаць гадоў. Дарэчы, называецца ён "Бібліятэка, патрэбная грамадству".

— І сельскія ўстановы ў ім заняты?

— Безумоўна. Больш за 300 бібліятэк змаглі паўдзельнічаць за гэты час у конкурсе. Для пераможцаў сярод гарадскіх і сярод сельскіх бібліятэк Першую прэмію (25 базавых велічынь) аплачвае наша галоўнае ўпраўленне, Другую — абкам прафсаюза работнікаў культуры, Трэцюю — абласная бібліятэка.

— Зразумела, што конкурс скіраваны вырашыць у пэўнай ступені ці не галоўную праблему — кадравую...

— Так. Вельмі хацелася б, каб спецыялісты былі і профі, і не збягалі б пасля адпрацоўкі... Трэба неадкладна ўзнімаць прэстыж прафесіі. Маю на ўвазе не толькі павышэнне заробкаў, але і стварэнне дадатковых умоў для больш эфектыўнага замацавання маладых кадраў... У нас, да прыкладу, няма свайго інтэрната, жыллё мы здымаем па дамовах у гарадскіх прадпрыемстваў.

— На сяле, ведаю, сітуацыя — не лепшая...

— Не, мы робім усё, што ў нашых сілах. Даём маладым надбаўку за кантракт. Але гэта — паўмера. Рэсурсы мы ўкладаем, у прафесію ўводзім, што таксама каштуе немалых намаганняў, а праз два гады развітваемся.

— Пра ўводзіны, як вы сказалі, у прафесію. У вас няма нараканняў на навучальныя ўстановы за тое, што выпускнікі прыязджаюць на першае працоўнае месца, даруйце "паўфабрыкатамі", бо колькасць гадзін на практычнае навучанне — мінімальная?

— Прэтэнзій асаблівых няма. Тут справа ў асобе. Для яе нават адукацыя — не самы вырашальны фактар: навучыцца ў любым выпадку. І ў нас вельмі шмат таму прыкладаў менавіта на раёнах, дзе сельскія бібліятэкары асвойваюць з поспехам праектную дзейнасць... Гаворка ж цяпер — пра людзей, што трапілі ў прафесію выпадкова, нават з вышэйшай спецыяльнай падрыхтоўкай. У большасці выпадкаў менавіта яны чакаюць завяршэння адпрацоўкі і беззваротна знікаюць. Ці ўвогуле "не даязджаюць"...

— І колькі такіх?

— Летась замаўлялі дзесяць спецыялістаў, атрымалі траіх. І гэта толькі па абласной бібліятэцы. На Гомельшчыне — 22 бібліятэчныя сістэмы. Не сакрэт, што работнікі з вышэйшай адукацыяй імкнуцца ў абласны цэнтр. І мы задавальняем іх жаданне, бо адчуваем у горадзе пастаянны кадравы дэфіцыт, асабліва — бібліяграфаў з валоданнем адпаведных бібліятэчных аўтаматызаваных праграм.

— Якім бачыцца "мясцовае" навучанне наяўных раённых кадраў?

— Яно павінна быць бесперапынным. І не толькі на базе абласной бібліятэкі (праўда, сёлета на курсы сельскіх бібліятэкараў мы групу не змаглі набраць: людзі не знайшлі сродкаў, каб прыехаць). Так бы мовіць, куставую вучобу ў раёнах могуць наладзіць Рэчыцкая, Светлагорская цэнтральныя бібліятэкі, дзе сістэма павышэння кваліфікацыі выбудавана такім чынам, што павучыцца тут могуць літаральна ўсе катэгорыі працаўнікоў. Ёсць тут школы камп'ютарнай пісьменнасці, школы кіраўнікоў... І ўсё гэта працуе паралельна з нашымі рэгулярнымі абласнымі семінарамі дырэктараў, маркетолагаў, краязнаўцаў, супрацоўнікаў дзіцячых устаноў...

— Новыя навучальныя дысцыпліны збіраецеся ўводзіць?

— Паўсюль кажуць пра неабходнасць бібліятэчнай "перазагрузкі". І тут без сучасных падыходаў не абысціся. Так што і новыя веды трэба будзе засвойваць, каб не замыкацца на фондах, каб развярнуцца тварам да чытача: ладзіць выязныя чытальныя залы, удасканальваць у раёнах праектную дзейнасць, скіраваную найперш на рост даверу з боку моладзі, людзей з абмежаванымі магчымасцямі...

— Пра фонды патлумачце...

— Мы іх калісьці закрылі. А цяпер патрэбны максімальна адкрыты доступ. Прынамсі, для актыўных чытачоў, якіх у нас прынята называць сябрамі бібліятэкі. Гэта стымул для павелічэння чытацкага кола.

— Не забудуся на люстэрка ў вашым фае, якое называецца "Лепшы чытач". Гэта сапраўды дысцыплінуе...

— А пра наш бібліятэчны тэатр "Гракі" ведаеце? Аналагаў на постсавецкай прасторы, напэўна, няма. На сёлетнім абласным аглядзе-конкурсе аматарскіх калектываў ён атрымаў Гран-пры. У трупе — нашы супрацоўнікі, не толькі жанчыны, але і мужчыны. Выступае тэатр для папулярызацыі кнігі, для больш даверанага стасункавання з чытачом. Акцёр абласнога драмтэатра Сяргей Пазняк — наш рэжысёр. На гастролі "Гракі" нават у Мінск выязджалі. Спектаклі праходзяць і ў бібліятэцы. 28 кастрычніка ў рамках міжнароднага супрацоўніцтва Курская абласная навуковая бібліятэка імя Мікалая Асеева падарыла нам 648 экзэмпляраў кніг лепшых расійскіх выдавецтваў. Цырымонія была прыгожа тэатралізавана з дапамогай бібліятэчнага тэатра. Дапамог, дарэчы, і Гомельскі дзяржкаледж мастацтваў імя Несцера Сакалоўскага... Больш як дзесяць гадоў на абласным радыё гучыць наш штотыднёвы часопіс "Бібліяпанарама", прысвечаны кнігам, чытанню і прафесіі бібліятэкара.

— Ніколі не сумняваўся, што жыццё абласной установы — насычанае і паўнацэннае. А як на сяле сітуацыя? Ці ўсе вясковыя ўстановы камп'ютарызаваны? У іншых абласцях, да прыкладу, скардзяцца: час на вёсцы камп'ютарную тэхніку на больш сучасную замяняць. Ды замяняць няма чаго: як не было ў асобных вёсках камп'ютара, так яго няма і па сёння. У вас гэтак жа?

— На жаль. І тое — адна з галоўных праблем. Не будзем улічваць бібліятэкі аграгарадкоў, дзе сітуацыя нармальная. Але іншых устаноў у нас — 257. Камп'ютарызавана 14 — пяць працэнтаў...

— Няўжо праблема — за пазабюджэт набыць ПК? Ён жа і не так дорага сёння каштуе...

— Даходы сельскіх устаноў насамрэч не такія вялікія, акрамя таго, падаткі з'ядаюць значную долю пазабюджэтных даходаў...

— На кангрэсе дэкан бібліятэчнага факультэта Універсітэта культуры і мастацтваў Мікалай Яцэвіч казаў пра расійскія рознаўзроўневыя дзяржпраграмы па падтрымцы бібліятэчнай справы...

— Нам патрэбна падобнае. І не толькі для сістэмнай камп'ютарызацыі, але і для паўнацэннага камплектавання фондаў. Мы па вобласці заўжды выконваем 15-працэнтнае патрабаванне. Але праблема вось у чым. За 2013 год тры раёны Гомельшчыны атрымалі ў сярэднім на адну бібліятэку па 50-60 кніг. Уявіце, колькі дасталося сельскім...

— Бібліобусы вырашаюць сітуацыю, выкліканую аптымізацыяй?

— Вырашаюць. У нас яны працуюць у 14 раёнах. Ёсць 85 маршрутаў. Адна машына наведвае асобна ўзятую вёску, дзе няма ўжо стацыянарнай установы, не менш за чатыры разы на год.

— Ваша стаўленне да інтэграцыі школьных і публічных устаноў?

— Самае прыязнае. Мы яе, дарэчы, распачалі яшчэ да рэспубліканскага эксперыменту. Базаванне ў школах вырашае праблему з паляпшэннем матэрыяльнай базы, з ростам наведвальнікаў...

— Шмат гадоў вядзецца дыскусія, ці варта захоўваць у тытуле ўстановы імя Леніна. Мо варта выкарыстаць найменні землякоў — Івана Навуменкі ці Івана Шамякіна?

— Усё ж не. Нас дзесяцігоддзямі прызвычаіліся называць «Ленінкай». Урэшце, Ленін шмат зрабіў у свой час для станаўлення і развіцця бібліятэчнай справы... К

Марына Рафеева. / Фота Кастуся АНТАНОВІЧА

фотафакт

Паўтысячагоддзя таму...

Нацыянальная бібліятэка Беларусі падрыхтавала альбом-каталог "Кніжная спадчына Беларусі", прымеркаваны да 500-годдзя нацыянальнага кнігадрукавання. У выданні прадстаўлены рукапісныя і друкаваныя кнігі, картаграфія, тамы па выяўленчым мастацтве і многае іншае. Праект быў рэалізаваны па замове і пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі краіны.

Паралелі: Расія — Германія

Чалавечае аблічча музыкі

Сафія ГУБАЙДУЛІНА, кампазітар (Расія — Германія):

— Мастацтва — гэта такая таямніца, якую нельга выказаць словамі. Тэхналогіі, выкарыстанне электронікі, разнастайнай "разумнай машынерыі" будзе, безумоўна, удасканальвацца і прывядзе да неверагодных вынікаў. Але мяне больш за ўсё хвалюе не тое, ці заменіць машына чалавека, а — сам чалавек. Ці не будзе ён, калі пойдзе па машынізаваным шляху, пакутаваць? Ці не акажацца прыгнечаны стан ягонай душы?..

Бо татальнае выкарыстанне камп'ютарнай тэхнікі ў кампазіцыі можа прывесці да таго, што вынік будзе стратай, а не набыццём. Прывяду такі прыклад. Адзін з маладых і вельмі паспяховых амерыканскіх кампазітараў неяк даваў радыёінтэрв'ю і на пытанне, ці зможа ён напісаць нейкі твор без камп'ютара, адказаў: "Вядома, не! Бо як я праслухаю тое, што атрымалася?" Гэта значыць, што ягоны ўнутраны слых ужо не дзейнічае, бо ім доўгі час не карысталіся. Але галоўнае для кампазітара — уменне чуць музыку ўнутры сябе. І раптам аказваецца, што гэта стала непатрэбным, таму і не развіваецца. Калі ж няма той унутранай музыкі, а ёсць толькі "знешняя", заснаваная адно на прафесійных навыках, творчасць ператвараецца ў вытворчасць — і не больш за тое.

З чалавекам непасрэдна звязана і паняцце чалавечнасці. А разам з ім — супрацьстаўленне: кроўная помста ці хрысціянская дактрына аб дараванні. Здавалася б, абсурд: падставіць другую шчаку. Але па-за тым стаіць ісціна: толькі дараванне выратуе чалавецтва ад пагібелі. Бо кроўная помста — бясконцая, яна скончыцца толькі тады, калі загіне апошні. Вось і атрымліваецца, што чысты ідэалізм не такі ўжо смешны ды бездапаможны: толькі ён, а зусім не прагматызм, можа прадоўжыць жыццё ўсёй планеты. Калі мы назапасілі столькі сродкаў масавага знішчэння, чалавецтва захавае сабе жыццё толькі тады, калі навучыцца дараваць...

Чалавек — гэта яшчэ і стасункі. Мне пашчасціла, што мае творы апынуліся ў руках геніяльных выканаўцаў. Калі я толькі пачынала сваю кампазітарскую дзейнасць, было адчуванне нейкай безнадзейнасці. Я марыла, каб мае творы былі выкананы хаця б для трох чалавек у зале. Сёння гэта ўжо не тры чалавекі, а куды больш. Але як утрымліваць такую ўвагу і надалей?..

Вельмі важная ініцыятыва музыкантаў-выканаўцаў, я вельмі цаню іхнія водгукі, іх крэатыўнасць. Падабаецца, калі яны самі штосьці прыдумляюць, дабаўляюць. Так, пасля сустрэчы з Фрыдрыхам Ліпсам на творчым гарызонце ўзнік баян. Я бачу ў гэтым інструменце нейкую істоту, якая зараз сцвярджае сябе. Ён быў пераважна акампаніятарам прыпевак, а цяпер гучна заяўляе пра сябе, выходзіць з сялянскай завалінкі ды гарадскога саду на філарманічную сцэну. Некаторыя лічаць яго "сыходзячым" інструментам, я ж, наадварот, — узыходзячым. Ён яшчэ ў стадыі развіцця. І мае такія якасці ды гучанне, якімі ніякі іншы інструмент не валодае.

Увогуле, у кожнага музычнага інструмента — сваё аблічча. Я да іх неабыякавая, у мяне шмат "улюбёнцаў". Віяланчэль, скрыпка, альт — што можа быць больш чароўным? Гэта нешта неверагоднае! Але толькі ў кантрабаса, які кампазітары часта абдзяляюць увагай, могуць атрымацца такія сумныя, кранальныя флажалеты — з адчуваннем глыбокага, але прыхаванага трагізму.

Музыка — не прымітыўнае мастацтва. Яе нельга зразумець — можна толькі адчуць. А самае глыбокае ўспрыняцце — гэта калі чалавек не ідзе непасрэдна за музычным тэкстам, а ўзнімаецца вышэй за яго...

Занатавала Надзея БУНЦЭВІЧ

Дзяржфільмафонд Расіі і дырэкцыя кінафестывалю **"Лістапад"** падпішуць сёння Пагадненне аб супрацоўніцтве.

Медыум і тры "як"

Маладая фатаграфія Беларусі: паміж фактам і выдумкай

Адной з вартасцей Месяца фатаграфіі ў Мінску стала магчымасць цеснага знаёмства з маладой беларускай фатаграфіяй. Тры персанальныя выстаўкі — Віктара Гіліцкага, Аляксандра Веледзімовіча, Аляксея Шлыка і Алега Шоблы (аўтараў, чые работы вядомыя не толькі нашай публіцы), — мультымедыйная прэзентацыя праекта "Сонны лес" Міхаіла Лешчанкі і таго ж Шлыка, выстаўка дзіцячай фатаграфіі з Паставаў — падзеі злучыліся ў блок, які дае ўяўленне пра тэндэнцыі ў гэтым сегменце.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Аляксей Шлык, Алег Шобла. З праекта "Рэканструкцыя № 1".

Фатаграфія як успамін

З праектам Віктара Гіліцкага "Апошні візіт" я насамрэч упершыню пазнаёмілася ў Кіеве. Летась ён трапіў у шорт-ліст пераможцаў партфоліа-рэвю ўкраінскага Міжнароднага форуму візуальнай культуры "Візіі". Праект быў заўважаны і адзначаны. У 2013-м ён стаў пераможцам "Прэс-фота Беларусі" ў намінацыі "Паўсядзённае жыццё", а сёння мы можам бачыць работу на пляцоўцы Музея сучаснага выяўленчага мастацтва.

Фотасерыя Гіліцкага — фіксацыя будняў ягонага дзядулі, які жыве ў беларускай вёсцы. Неяк летам унук прыехаў пагасцяваць да роднага чалавека, і так атрымалася, што ягоная паездка стала апошнім візітам: праз месяц дзядулі не стала…

На чорна-белых фатаграфіях — справы сталага чалавека: дзядуля — на падворку хаты, у самой хаце, вось ён чытае газеты, глядзіць у акно… Мяркую, многія бачылі падобныя сцэны з жыцця сваякоў, але мяжа смерці заўжды ператварае звычайныя рэчы ў гісторыю... І не толькі асабістую, хоць фатаграфіі кранаюць менавіта адсылкай да ўласных страт, сямейных сувязей.

Мы бачым на кадрах не толькі дзядулю, але і гісторыю асобнай вёскі, нават — эпохі… Калектыўнае спазіраецца праз асабістае. У экспазіцыі прадстаўлены і аўдыязапісы: надзеўшы навушнікі, можна пачуць, як дзед Іван чытае газету "Звязда" ці распавядае пра суседзяў… Надзвычай важным транслятарам светапогляду і атмасферы "мікрасусвету" становіцца радыё, якое размясцілі на другім паверсе музея, — радыёкропка, што, здаецца, будзе вяшчаць заўсёды. Гэты артэфакт — нібы выратавальны круг прысутнасці "Вялікай зямлі"…

Насамрэч, гэтую амаль кінестэтычную самоту, цішыню, супыненне, але не закінутасць, можна было перадаць, і падкараціўшы візуальны шэраг экспазіцыі, вызваліўшы больш прасторы для атачэння работ. Віктару ўдалося стварыць моцныя партрэты ў часе і па-за ім, але ж уключэнне аўдыязапісаў, аб'ектаў у праект патрабуе дакладнага вызначэння іх месца. Мо таму яшчэ адзін артэфакт — сямейны альбом з наўмысна размытай мяжой старых і новых фотаздымкаў — не прагучаў як належыць: наведвальнікі часам не ўспрымалі яго як частку экспазіцыі.

Разнастайнасць медыя падаецца перавагай "Апошняга візіту" і пашырэннем прыватнай гісторыі, з якой "вырастае" гісторыя пакалення. Гэты праект кранае любоўю, але ён здольны распавесці больш пры варыятыўнасці падачы. Нават гаворачы пра сваіх блізкіх, мы прамаўляем больш, чым падаецца.

Фатаграфія як дотык

Выстаўка віцябчаніна Аляксандра Веледзімовіча таксама ў МСВМ мела назву "Кунсткамера". Нагадаю, што значэнне апошняга слова — "кабінет рарытэтаў" або "калекцыя рэдкасцяў" і "месца іх захавання", і гэты пільны погляд даследчыка, які вывучае атачэнне, у пэўнай ступені адлюстроўвае пазіцыю аўтара ў дачыненні да фатаграфіі наогул. Аляксандр выкарыстоўвае азначэнне "медыум" (пасрэднік), кажучы пра яе: і сапраўды, яго фота не проста "фіксуе" рэальнасць, а дазваляе прадметам набываць сваю сутнасць ды адчувальнасць. Аўтар змяшчае рэчы, чалавека ва ўмоўную прастору (так, гэта можа быць "кабінет" — пакой, а можа — ландшафт), каб паглядзець на тое, як яны выпраменьваюць сваю вітальнасць. Работы Веледзімовіча маюць дзіўную вартасць: яны даюць адчуванне дотыку да аб'екта, што захаваны на фота.

Аляксандр Веледзімовіч. З праекта "Кунсткамера".

Напрыклад, мы бачым на здымку паверхню драўлянага стала, на якой разліта малако, руку дзяўчыны… — і адбітак, умоўна кажучы, уключае рэцэптары. Складана апісаць: гэты дотык знаходзіцца дзесьці на мяжы ментальнага і фізічнага ўзроўняў. Па сутнасці, "кунсткамера" Веледзімовіча — такі пазачасавы тунэль, дзе рэчы выяўляюць сябе.

Цікава, што, пры ўсёй удумлівасці падыходу, ягоная фатаграфія не пазбаўлена іроніі, самаіроніі. На прыкладзе дадзенай экспазіцыі Аляксандр дазваляе сабе пагуляць з напаўненнем "кунсткамеры". Ён нават змяшчае ў гэты "кабінет" самога сябе, свае фантазмы, каб у выніку "знішчыць" звыклыя выявы свету (тут у анатацыі з'яўляецца слова "іконы"). Падаецца, фатаграфіяй можа быць усё, што заўгодна, кажа аўтар. Галоўнае — дазволіць ёй напаўняцца святлом і сэнсам.

Віктар Гіліцкі. З серыі "Апошні візіт".

Фатаграфія як пісьмо

Не менш цікавы падыход да фатаграфіі дэманструе і выстаўка Аляксея Шлыка і Алега Шоблы "Рэканструкцыя № 1", якая суседнічала з экспазіцыяй Аляксандра Веледзімовіча. Тут аўтары таксама працуюць з прынцыпамі "іканаграфічнай выявы", але ў іх варыяцыі гэта прамое выкарыстанне пісьма на цвёрдай паверхні — дубовых і кедравых дошках, з той толькі розніцай, што замест фарбаў Аляксей і Алег задзейнічаюць святлапіс — фатаграфію. Іх работы — срэбра-жэлацінавыя адбіткі на дрэве, якія адсылаюць да біблейскіх міфаў і сюжэтаў.

"Рэканструкцыя № 1" узнаўляе два архетыпічныя макракосмы — мужчынскі і жаночы, якія сёння праблематызуюцца шматпалярнасцю сучаснай культуры", — пазначаецца ў анатацыі, але ў дадатак хочацца сказаць, што тыя "два макракосмы" падаюцца праз паняцце цялеснасці. Ці змянілася гэтае вымярэнне сёння? Што значыць "мужчынскае" ці "жаночае" зараз? Аўтары, разважаючы на гэты конт, спрабуюць парушыць межы ўспрымання мужчынскага і жаночага "прызначэнняў". Актуалізуючы біблейскія міфы, фатографы праводзяць і іх "рэвізію" — "рэканструкцыю № 1". І фатаграфія ў дадзеным выпадку таксама становіцца сродкам, які праходзіць этап своеасаблівай "рэканструкцыі" — аднаўляючы сваю вартасць сакральнага "святлапісу".

Кацярына Смурага. З фотасерыі ў часопісе "Imbalance".

■■■

Насамрэч, гэтымі выстаўкамі маладое фота сябе на Месяцы фатаграфіі не абмежавала.

Праект Аляксея Шлыка і Міхаіла Лешчанкі "Сонны лес" прысвечаны Белавежскай пушчы. Ён выконваецца з задзейнічаннем тэхнікі мокрага калодыя ў стварэнні выявы лесу. Словам, медыяльнасць фатаграфіі, выкарыстанне яе магчымасцей у залежнасці ад патрэбнага "месэджу", паслання — той трэнд, які прадэманстравалі маладыя фатографы на фестывалі. І асабліва парадавала тое, што фота ў гэтай спробе спасціжэння свету аказалася канкурэнтаздольным з іншымі сучаснымі медыя. Хачу дадаць, што ў рамках падзеі адбылася прэзентацыя інтэрнэт-часопіса "Imbalance" ("Дысбаланс"). Мэта яго — "пошук і падтрымка маладых беларускіх аўтараў, наданне бачнасці іх праектам". Гэта ўжо трэці выпуск выдання (яно звычайна ўтрымлівае серыі пяці аўтараў — гэта каля ста старонак), рэдактарам якога з'яўляецца таксама прадстаўнік маладога пакалення фатографаў — Аляксандра Салдатава.

— Сёння маладыя фотамайстры сутыкаюцца з тым, што часам ім няма дзе знайсці падтрымку, паказаць сябе. Тым больш, калі асноўныя пазіцыі ў беларускай фатаграфіі займае клубная, — патлумачыла матывацыю стварэння падобнага рэсурсу Аляксандра. — Але апошняе — усяго толькі адзін з яе кірункаў… Мне цікавая тая фатаграфія, якая гаворыць пра сучаснасць", — адзначае свае перавагі рэдактар, што працуе з работамі як куратар.

Канчатковым жа перакананнем, што ў існаванні маладой беларускай фатаграфіі не варта сумнявацца, стаў для мяне дакументальны фільм Максіма Багдановіча "BY NEW", які прадставіў маладых аўтараў нашумелай кнігі "BY NOW", што распавядае пра сучасную Беларусь. Прэм'ера стужкі таксама адбылася ў рамках фотафоруму. Магчыма, аўтары, чые работы ўвайшлі ў выданне, ініцыяванае Андрэем Лянкевічам і падтрыманае нямецкімі куратарамі, і не могуць казаць за ўсё пакаленне. Ды ўсё ж тое, што яны кажуць за сябе, — зусім не падаецца эпігонствам.

К

Гаворку пра найбольш адметныя падзеі Месяца фатаграфіі ў Мінску мы распачалі ў "К" № 43. Сёння ж размова пойдзе пра маладую генерацыю беларускіх фатографаў.

Ва ўрачыстасцях з нагоды 500-годдзя кананізацыі **святога Елісея Лаўрышаўскага** ўзялі ўдзел блізу 700 паломнікаў.

Раскадроўка

Дэмаграфічнае пытанне — адно з вострых. Самых актуальных, так бы мовіць. У эпоху "асабістага росту" ды "персанальнага поспеху" і ў грамадзян, і ў грамадзянак, на жаль, часу на нараджэнне, а тым больш — на выхаванне дзяцей, застаецца не так і шмат. У пагоні за фінансавым дабрабытам ды жыццёвым камфортам сучасны чалавек вельмі часта грэбуе самым важным з таго, для чаго яго прызначыла прырода. Тое, што і бацькоўства, і мацярынства прыносяць галоўную радасць у жыцці, многія, асабліва маладыя, пачынаюць разумець не адразу, часам занадта позна.

Антон СІДАРЭНКА

Не "Доктар Хаус"

Пра павелічэнне нараджальнасці праз кіно

Практычна ва ўсіх развітых краінах (у тым ліку і ў Беларусі) існуюць спецыяльныя праграмы па павелічэнні нараджальнасці. Але акрамя матэрыяльных выгод адным са складнікаў з'яўляецца прапаганда нараджальнасці і сямейнага ладу жыцця. Зразумела, у сучасным інфармацыйным грамадстве, дзе кіруе балем мас-культура, заклікі "больш нараджаць" у выглядзе тэлевізійных роліку ды прыдарожных бігбордаў выглядаюць, па меншай меры, наіўна. А вось магчымасці такога, здавалася б, састарэлага выгляду мас-медыя, як кінематограф, аказваецца, да гэтага часу працуюць бездамоўна.

Свежы прыклад. У кінатэатрах Мінска які тыдзень з вялікім поспехам ідзе фільм "Суддзя". Тыпова амерыканская гісторыя з усім наборам галівудскіх штампаў апавядае аб паспяховым адвакаце, які ў маладосці збег у буйны мегаполіс, а цяпер выраашыў вярнуцца ў родную глыбінку, каб быць разам са сваімі... Уласна, матыў вяртання ў сям'ю, усведамлення таго, што самае галоўнае багацце ў ёй — гэта дзеці, прысутнічае ў кожнай другой стужцы "Фабрыкі мроіў". І не таму, што заакіянскія прадзюсары выконваюць рашэнні органаў улады (хоць пэўны лабізм нацыянальных інтарэсаў нязменна прысутнічае ў прадукцыі кожнай буйной галівудскай кампаніі). А таму, што на сямейна-дзіцячую тэму існуе грамадскі попыт. Прычым нават у самых маладых грамадзян, што складаюць асноўную аўдыторыю кінатэатраў.

Зразумела, айчынныя кінематаграфісты зусім не супраць сем'яў і дзетараджэння. Але вось выказацца пра гэтыя праблемы таленавіта ўмеюць толькі асобныя творцы. Напрыклад, аўтары чарговага праекта Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" "Вой, мамачкі!..", праца над якім пачалася амаль два гады таму. Зараз гэты 12-серыйны фільм завершаны, але ён пакуль не з'явіўся на айчынным тэлеэкране, хоць першыя дзве серыі ўжо былі паказаны на рускамоўных кабельных каналах у розных краінах і атрымалі выключна станоўчыя водгукі. Пасля тых першых паказаў карціна імгненна з'явілася ў Інтэрнэце і займела ўжо сусветную аўдыторыю.

Кадры з фільма "Вой, мамачкі!...".

"Надзіва добры, станоўчы, сямейны, хатні фільм, ад якога павяе ўтульнасцю і клопатам..." (Лілія, Украіна). "...Вялікі дзякуй прадзюсару, што не ператварыў стужку ў чарговы клон "Доктара Хаўса", а пакінуў яе простай, без мудрагелістых паваротаў, з прыгожым фіналам, які дае надзею ўсім героям гэтага фільма, дый тым, хто марыць зведаць мацярынства!.." (Вольга, Ізраіль). "...Гэты серыял абавязкова знойдзе свайго гледача. І гэтым гледачом, паверце, будуць не толькі будучыя парадзіхі. Я, маці дваіх дзетак, з задавальненнем буду яго глядзець. А яшчэ хацелася б, каб яго паказвалі ў радзільнях, каб будучыя матулі не баяліся ісці на роды, бо пасля болю і пакут будзе такі жаданы і доўгачаканы ЦУД!.." (Лідзія, Запарожжа).

Эмацыйныя, немудрагелістыя, але такія важныя для беларускага кіно станоўчыя водгукі ад незаангажаваных гледачоў! Будзем аб'ектыўнымі, у апошні час айчынныя стужкі такую ацэнку атрымліваюць нячаста. А тут — адразу шмат і выключна ў найвышэйшай ступені. Што ж, усіх датычных да стварэння гэтага фільма можна сапраўды павіншаваць з творчым поспехам! Для рэжысёра Івана Паўлава ды сцэнарыстаў Юліі Ляшко і Людмілы Перагудавай ён, праўда, не першы. Але ў дадзеным выпадку больш чым важкі: такіх тэлевізійных праектаў на Нацыянальнай кінастудыі пакуль не рабілі. "Вой, мамачкі!.." — сапраўднае тэлевізійнае кіно, менавіта таго фармату, што цяпер найбольш запатрабаваны тэлеканаламі ды гледачамі ўсяго свету. Дванаццаць серый — дванаццаць паўнавартасных гісторый, у кожнай з якіх героі шукаюць і знаходзяць сваё шчасце. Звязаны ўсе гісторыі галоўнымі героямі — супрацоўнікамі аддзялення паталогіі аднаго з радзільных дамоў у вялікім горадзе, у якім адгадваецца наша сталіца. Урачы і пацыенты, сваякі і калегі, юныя і досведчаныя — усе аб'яднаны адной маючай адбыцца падзеяй: з'яўленнем на свет новага Чалавека…

Лішне казаць, што фільмаў, асабліва тэлевізійных серыялаў, на тэму родаў і мацярынства апошнім часам выходзіць нямала. Але ў дадзеным выпадку сюжэт пабудаваны вакол спецыялізаванага аддзялення, у якім будучыя мамы ў чаканні дзіцяці ляжаць на так званым захаванні. Беларуска-расійская стужка (створаная сумесна з маскоўскімі прадзюсарамі) "Вой, мамачкі!.." вылучаецца сваім мастацкім узроўнем, арыгінальным сюжэтам і цудоўнай ігрой акцёраў. Сваю ролю адыграў і той факт, што карціна здымалася ў адпаведным аддзяленні 5-й мінскай клінічнай бальніцы, персанал і пацыенты якога "сыгралі" саміх сябе.

Зразумела, асноўныя ролі выканалі прафесіяналы. Для актрысы тэатра і кіно Веры Паляковай галоўная роля загадчыка аддзялення Веры Міхайлаўны стала значным творчым дасягненнем. Іх дуэт з Ігарам Сіговым атрымаўся невераагодна суладным і, мабыць, самым цікавым ва ўсёй карціне. Не менш важную па значнасці ролю ўрача ў фільме бліскуча сыграў папулярны расійскі серыяльны акцёр Аляксандр Макагон. Цікавых герояў увасобілі ў стужцы беларускія акцёры Міхаіл Зуй, Марына Дзянісава, Таццяна Чардынцава, Святлана Зелянкоўская, Алеся Пухавая, Святлана Нікіфарава, Таццяна Каліх, Вольга Скварцова. Спіс можна доўжыць: арыгінальная сюжэтная схема карціны дазволіла сыграць невялікія, але вельмі яркія вобразы вялікай колькасці выдатных выканаўцаў. Заўважна "засвяцілася" ў ёй зоркі расійскага кіно Сяргей Астахаў і Сяргей Чанішвілі. Ролю "бабулі з народу" — вясёлай і па-народнаму мудрай санітаркі — атрымала вядомая па сіткаме "Мая цудоўная няня" маскоўская актрыса Аляксандра Захарава.

Для шматвопытнага Івана Паўлава "Вой, мамачкі!.." сталі цудоўнай нагодай праверыць не толькі свае творчыя, але і арганізатарскія здольнасці: здымкі праходзілі ў не самых простых умовах. Але ў выніку беларускі рэжысёр не проста справіўся з выторчымі ды прыроднымі цяжкасцямі, але і зняў, мабыць, свой самы лепшы фільм. Узятая аўтарамі ў самай першай серыі інтанацыя — цёплая і адкрытая — застаецца да самага фіналу і загравае любога гледача, а не толькі таго, для якога, па ідэі, прызначаны стужкі "пра раддом". Шмат у чым гэта заслуга аператара карціны Вячаслава Дунаева, чыя прафесійная работа ў фільме цалкам вартая вялікага экрана.

Увогуле, "Вой, мамачкі!.." — карціна, якая абавязкова павінна ўбачыць экран бліжэйшым часам: свой зацікаўлены глядач ёй гарантаваны. І не толькі з катэгорыі, якая аддае перавагу "мыльным операм". Гэтым разам Нацыянальная кінастудыя зрабіла якасную меладраму, паўнавартасны камерцыйны прадукт, здольны пры правільным падыходзе і ўмелым маркетынгу прынесці годны прыбытак. Ну а для многіх гэты фільм, упэўнены, стане калі не прамым заклікам палепшыць дэмаграфічную сітуацыю ў сваёй сям'і, то вельмі добрай нагодай яшчэ раз прызнацца ў любові сваім родным ды блізкім.

На адным з кінафорумаў у Сеціве глядачка з украінскіх Чаркасаў напісала: "Добры фільм! Але чамусьці ўсе стужкі, якія я гляджу, патрабуюць працягу. І гэтая — не выключэнне..."

Працягу фільма, працягу Сям'і, хочацца дадаць... **К**

Мастыхін

Карціны Мікалая Шкута, дацэнта кафедры выяўленчага мастацтва мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, вядомыя не толькі віцебскім аматарам жывапісу. Работы мастака неаднаразова экспанаваліся ў сталіцы нашай рэспублікі, Расіі, Польшчы, Эстоніі, Германіі, Ізраілі, Вялікабрытаніі. Многія нашы суайчыннікі і грамадзяне суседніх краін могуць пахваліцца тым, што папоўнілі свае прыватныя калекцыі яго жывапіснымі акварэлямі.

Хто ўсё лепшае прыдумаў за нас?

Мікалай Шкут: мастак, улюбёны ў прыроду

Мікалай Шкут. "Лясное возера".

Летам гэтага года Мікалай Мікалаевіч адзначаў сваё 70-годзе, а ў кастрычніку з гэтай нагоды прэзентаваў на родным факультэце юбілейную выстаўку. На ёй былі прадстаўлены лірычныя пейзажы, нацюрморты і партрэты родных. Амаль усе карціны напісаны за лета, бо мастак лічыць, што акварэлі павінны стварацца хутка: толькі так можна захаваць свежасць фарбаў, дасягнуць неабходнага колеравага эфекту і пазбегнуць паправак.

— Я ўжо не першы год пішу без палітры, — зазначае Шкут. — Шукаю патрэбны колер адразу на паперы, практыкуючы тэхніку "па-мокрым". Даволі рэдка пішу з натуры, не часта раблю эскізы. Відаць, у мяне настольні фатаграфічная памяць, што я магу, седзячы ў майстэрні, маляваць краявіды па памяці, прычым зіму магу пісаць улетку — і наадварот…

На малюнках мастака кожны віцебчанін можа знайсці свой любімы куток Прыдзвінскага краю. Тут і азёры Лосвіда ды Вымна, і гарадскі пейзаж, і лужаснянскія краявіды... Прычым прырода ў мастака атрымліваецца пранізліва-тонкай і ў той жа час жыццесцвяржальнай ды маляўнічай.

— Я заўсёды запэўніваю сваіх студэнтаў, што не трэба нічога выдумляць, — падкрэслівае Шкут. — Дастаткова проста паглядзець навокал: прырода ўсё лепшае ўжо прыдумала за нас. Я наогул лічу, што толькі ў прыроды можна навучыцца фарбам ды сапраўднаму адчуванню колеру і святла…

Сапраўды, захапленне колерам бачнае ў кожнай карціне юбіляра. Цікава, што лета і зіму Мікалай Мікалаевіч амаль не малюе, аддаючы перавагу пераходным порам года — вясне і восені, калі можна паказаць прыгажосць прыроды ва ўсёй яе разнастайнасці.

Самабытна выглядаюць і нацюрморты мастака: тут не ўбачыш нязвыклых воку рэчаў, — толькі ўсім вядомыя прадметы побыту, лугавыя кветкі, садавіну, грыбы. Бо галоўнае прызначэнне творцы, — на яго думку, — адкрываць прыгажосць ды каштоўнасць паўсядзённага свету.

Гэта Мікалай Мікалаевіч і даводзіць сваім студэнтам, у якіх выкладае такія дысцыпліны, як малюнак, кампазіцыя і акварэльны жывапіс. Гэтая думка скразной лініяй праходзіць і праз усе навуковыя працы ды навучальна-метадычныя дапаможнікі, у розныя гады напісаныя ім. Больш чым за сорак гадоў працы выкладчыкам (а з 1980-га па 1985-ы — дэканам мастацка-графічнага факультэта) Мікалай Шкут паспеў выхаваць не адно пакаленне аматараў акварэлі — тых, хто, як і ён, бачыць вачыма і адчувае сэрцам прыгажосць беларускай прыроды…

Алеся ДУБРОЎСКАЯ
Віцебск

З 28 лістапада па 4 снежня ў Гомельскім абласным драмтэатры — XII Міжнародны фестываль **"Славянскія тэатральныя сустрэчы"**.

Мастыхін

Індэкс празрыстасці акрэсліваецца градусам адкрытасці і шчырасці соцыуму. Ён выступае катэгорыяй меры балансу і дысбалансу, напоўненасці і пустэчы, названага і ўяўнага. Гэтай жа мерай вымяраецца сусвет у мастацтве шкла. Шкло — амаль адзіны прыродны матэрыял, здольны адкрываць прыхоўваючы, даючы магчымасць дакрануцца — нават без тактыльнага дотыку.

Які "Індэкс празрыстасці"?

У Гомелі прадстаўлена шкляная канцэптуалістыка

10 кастрычніка ў гомельскай Карціннай галерэі Гаўрылы Вашчанкі адбылося адкрыццё выстаўкі "Індэкс празрыстасці", на якой былі прэзентаваны ўнікальныя шкляныя аб'екты: не нейкія там шклянкі/вазы/талеркі, а паўнавартасныя канцэптуальныя выказванні дваццаці розных мастакоў. Удзельнікамі праекта сталі вядучыя замежныя творцы, а таксама прадстаўнікі айчыннай "шкляной супольнасці": сталыя прафесіяналы і студэнты.

Мы пастараліся прадставіць гомельскаму гледачу самыя цікавыя, на наш погляд, еўрапейскія імёны. Зорка першай велічыні на выстаўцы — унікальны мастак з Прагі Іржы Шугаек, маг гутнага выдзімання. Жанчыны і птушкі натхняюць яго на "шаманскія танцы" каля шкляной печы. І трэба бачыць, як віртуозна Іржы валодае трубкай для выдзімання: гэта сапраўды тэатральнае дзейства! На мяжы магчымасцей ды фізічных уласцівасцей матэрыялу мастак застаецца спакойным, ствараючы шэдэўры, якія наўрад ці хтосьці зможа паўтарыць. У экспазіцыі ёсць адна з яго "Птушак", і "Жанчына" таксама маецца.

Побач — работы нашых сяброў з суседняй Літвы: выкшталцоная "Ледзяная кветка" Рэмігіуса Крукаса — слынная ўладальніка прыватнай шкляной студыі "GlassRemis" з Панявежыса. І "Ачаг" яго жонкі Індрэ Стулгайтэ-Крукіенэ — вельмі глыбокі і філасафічны твор, што апелюе цікавай супастаўленні класічна-вытанчаных тэхнік шкла ды інертных матэрыялаў скульптуры ("Цвіль на хлебе") і паўсядзённасці ("Карап").

"Сыны гаспадара В" — такую назву мае выклік: гаворка пра чырвоны бліскучы аб'ект мастака з Нідэрландаў Эда ван Дэйка. Ён дэманструе сваё захапленне модульнымі структурамі, бо тэхналагічна шкло абмежавана параўнальна невялікімі памерамі, і выйсце менавіта ў тым, каб ствараць з мноства невялічкіх модуляў вялікія аб'ёмы. Гэтая работа — пра чалавечае цела; яна, адна з шасці іншых, адносіцца да розных яго частак. Каб зразумець, што мае на ўвазе мастак, трэба ўявіць гэтыя крывава-чырвоныя рыскі ў момант, калі яны фіксуюць вашу ўласную шыю. Так-так, менавіта пра яе вядзе гаворку мастак.

Твор датчаніна Марыі Банг Ісперсан не мае назвы, але нешта беззумоўна даносіць. Марыя даследуе межы пластычных магчымасцей шкла, эксперыментальна "спазнае" яго характар. Дадзены аб'ект — усяго толькі фрагмент, фаза працэсу намотвання гарачага шкла, якое льецца тонкай ніткай, амаль павуціннем, на маналітную яго порцыю.

На першым плане — цикл работ "Супрэматычны сняданак".

Ў ліпі. Работы "Піраміда" і "Форма 1".

Мастачку цікавіць выключна энергія працэсу-дзеяння і нічога больш. Дэкаратыўныя ўласцівасці шкла быццам прынцыпова не трапляюць у фокус яе увагі.

На такім высокім міжнародным узроўні беларускія мастакі выглядаюць цалкам годна. Працэсы развіцця айчыннага канцэптуальнага шкла сінхранізаваны з сусветнымі. Прыкладам гэтаму — творы айчынных аўтараў. Так, "Уздых" Вольгі Сазыкінай — бадай, першая канцэптуальная работа ў беларускім шкларобстве, створаная ў 1984 годзе. Аб'ём чалавечых лёгкіх, празрыстая "бурбалка" са следам далоні — бесцялесная тонкае шкло, якое абмяжоўвае сабой фазу жыцця арганізма — уздых.

Іншыя беларускія творы — больш сучасныя і не менш цікавыя. Феерверк шкляных ідэй ды тэхналогій дэманструюць маладыя мастакі Барысаўскага крыштальнага завода і шклозавода "Нёман" Дар'я Ціхая і Ганна Аляксейчык, Анатоль Калугін, які працуе са шклопадобнымі глазурамі, а таксама — студэнты кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, многія з якіх, між іншым, родам з Гомельшчыны, дзе і дэманструецца "Індэкс…": Кацярына Крыштопік, Марыя Анціпава, Юлія Баброва, Дар'я Золатава, Вілета Кір'янчык, Хрысціна Ракіцкая, Марыя Сядова, Мар'яна Валодзіна, Яна Цярэшчанка і Яна Сычова. Да экспазіцыі таксама дададзены колькі апошніх прац куратараў.

Кожная работа, прадстаўленая ў рамках "Індэксу празрыстасці", — унікальны, магчымы толькі ў шкле твор мастацтва — персаналізаваны міні-сусвет. Каб яго зрабіць, кожны з мастакоў выбірае сваю аўтарскую тэхналогію, тэхніку ды форму. І, у рэшце рэшт, — асабістыя межы празрыстасці — жыцця і матэрыялу. Варта прыйсці ў Галерэю Вашчанкі да 16 лістапада, каб судакрануцца са шклянымі разнастайнасцямі, здзівіўшыся іх колькасці, а магчыма, і разгледзець праз шкло ўласныя жаданні ды памкненні…

Павел ВАЙНІЦКІ,
Алена АТРАШКЕВІЧ-ЗЛАТКАВІЧ,
кураторы выстаўкі

Тэатральная плошча

"Тата" — так назвалі новы спектакль у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы паводле п'есы Дзмітрыя Багаслаўскага "Ціхі шоргат сыходзячых крокаў" (у новым перакладзе — "Ціхі шолах развітальных крокаў").

Надзея БУНЦЭВІЧ

"Тата" прыйшоў

Сцэна са спектакля "Тата". / Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Адкрытая заслона дапамагае гледачу настроіцца на "танальнасць" спектакля яшчэ да яго пачатку. Купка свежавыкапанай зямлі, дзве лапаты, лесвіца ў неба, незразумелая чорна-белая пляміна, спраецыраваная на заднік (ці то гэта скажоныя абрысы Беларусі, ці то нейкі згустак касмічнага пылу, а мо і наша ўяўленне пра выгляд-прывід душы) — размова пойдзе пра жыццё і смерць, зямную рэальнасць і духоўныя сферы. Насярожвае хіба тое, што калі заснаваная на прадметах-сімвалах сцэнаграфія захаваецца да канца спектакля, дык можа і надакучыць. Ажно не! Адметнасць пастаноўкі — у руху элементаў, на якім пабудавана ўся дзея. Рух пачынаецца з праекцыі: пляміна разрастаецца, захопліваючы не толькі заднік, але і бакавыя панэлі-"ралеты". Набліжаючыся, тая пляма аказваецца варонкай калодзежа, у які мы быццам зазіраем зверху ўніз (відэарэжысёр і адначасова кампазітар — Мацвей Сабураў). А сам калодзеж, што вырасце з-пад зямлі, стане адным з асноўных сімвалаў п'есы ды спектакля, асацыюючыся і са скарбонкай мудрасці, і з жыватворнай крыніцай. Нават калодзежнае вядро ў пэўныя моманты выступіць "у ролях" і "чорнай дзіркі", дзе знікаюць грошы, і звона (маўляў, час прабіў).

Спалучэнне некалькіх ракурсаў (збоку-зверху, звонку-знутры ды іншых), дадзенае не мантажом, як у кіно, а адначасова — праз бачнае гледачу сцэнічнае дзейства і яго відэавыяву, трывала замацавалася ў сучасным тэатры ў самых розных варыянтах. Таму можна толькі вітаць з'яўленне гэтага прыёму на галоўнай драматычнай сцэне краіны. Прыкметай сучаснасці сталі і іншыя сцэнаграфічныя цікавосткі, асабліва — нячутныя перамяшчэнні па сцэне "подыумаў" з мэбляй ды героямі. "Састыкаваўшыся" ў хатні інтэр'ер, яны раптам, як толькі ўпершыню прагучаць словы пра продаж дома, ад'едуць у супрацьлеглыя бакі. І тая шчыліна міжволі выкліча паралелі з купалаўскім "Раскіданым гняздом".

Сцэнаграфічнае рашэнне Барыса Герлавана становіцца самым, бадай, моцным складнікам спектакля, прытым што акрамя мастацкай функцыі выконвае, яшчэ і "рэкламную", дэманструючы багатыя тэхнічныя магчымасці адрамантаванай і нашпігаванай сучасным абсталяваннем сцэны (пакінем "за дужкамі" некаторыя тэхнічныя накладкі, калі артыстам даводзілася самім рухаць "спынены матор" ці падымаць пераклены камод: любыя механізмы, хай і на радыёсігналах, як у дадзеным выпадку, патрабуюць вельмі ўважлівага стаўлення і часам могуць псавацца). Убачанае пераконвае, што ў гэтым тэатры можна ставіць самыя неверагодныя спектаклі для дзяцей — ад "Алісы ў Краіне цудаў", заснаванай на пастаянных пераўвасабленнях герояў ды "карагодзе" рэчаў, да якога-небудзь "крутога" нацыянальнага фэнтэзі пра тыя ж пошукі папараць-кветкі. І ўвогуле — для рэжысёраў на гэтай сцэне няма немагчымага, трэба толькі "ідэю закінуць" ды з канцэпцыяй вызначыцца.

На жаль, апошні пункт у спектаклі відавочна "прабуксоўвае". Справа яшчэ і ў тым, што Кацярына Аверкава даўно паспела зарэкамендаваць сябе ўдумлівым, крэатыўным пастаноўшчыкам, таму ўсе чакалі ад яе не звыклай "шараговай" прэм'еры, а сапраўднай мастацкай з'явы. Абавязваў да гэтага і ўзровень Міжнароднага форуму тэатральнага мастацтва "ТэАРТ" з неверагодным "Чайкай" у пастаноўцы О.Каршуноваса, бо прэм'ера "Таты" закрывала гэты фэст. Нарэшце, абавязваў і зварот да п'есы, якую год таму, таксама ў рамках "ТэАРТа", увасобіў у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі малады кыргызскі рэжысёр Шаміль Дыйканбаеў. Таму, зразумела, чакалася, што новая сцэнічная версія будзе на парадак вышэйшай за ранейшую. І не толькі праз іншы беларускамоўны пераклад, зроблены Ірынай Герасімовіч. Няўжо змена назвы перашкодзіла? Маўляў, як карабель назавеш...

Назва, вядома, ні пры чым. Але цяперашняя — "Тата" — адлюстроўвае не толькі пазбаўленне аповеду некаторай містыкі (у Купалаўскім п'еса падкарочана), але і найлепшым чынам адпавядае размеркаванню акцёраў. У цэнтры спектакля аказваецца не Аляксандр (Раман Падаляка, Сяргей Рудзня), чыімі вачыма мы глядзім большую частку дзеяння, а ягоны бацька. Генадзь Аўсяннікаў становіцца ў гэтай ролі своеасаблівым камертонам пастаноўкі, задаючы папраўдзе "чысты" тон абсалютна натуральнага сцэнічнага існавання і маўлення. На яго фоне ледзь не ўсе астатнія артысты, за выключэннем хіба невялічкіх роляў Наталлі (Зоя Белахвосцік) і Юрасіка (Мікалай Кучыц), успрымаюцца гэткім "фальшам". Нават таленавіты Раман Падаляка, не шкадуючы патэтыкі, працягвае іграць тут сваіх ранейшых рамантычна-ўзнёслых герояў. Дый адкрыта сатырычныя, на мяжы пародыі-шаржу, п'яныя выкрунтасы Зіны (Вольга Няфёдава) выглядаюць "пераносам" на глебу псіхалагічнага тэатра элементаў камедыі масак, якой апошнім часам купалаўцы прытрымліваліся часцяком. Які ўжо тут шэпат-шолах? Які, прабачце, "сон у 2-х дзеях"? Усё — гучна, "шырокім мазком", без той нервова-кранальнай трагічнасці, якой год таму скарыў РТБД. Але галоўнае — калі чытаць п'есу больш цікава, чым глядзець спектакль, дык... пры чым тут тэатр? **К**

Дзяржаўны ансамбль танца Рэспублікі Беларусь прадставіць праграму з нагоды 55-годдзя калектыву ў Маскве.

Акцыя "К": журналісцкі аўтапрабег па СДК і не толькі

Партрэт германавіцкай культуры ў вясковым інтэр'еры

Прыгоды фондаў

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Глінамес і ткачыха

Скіроўваемся да чарговай установы культуры колішняга мястэчка — Дома ганчара. Праўда, ужо не першы год тут праводзяцца заняткі не толькі па ганчарстве і па вырабе глінянай цацкі, але і па ткацтве ды вязанні. Прычына такога суседства невыпадковая. Двое майстроў — Сяргей і Ганна Рымдзёнкі — сям'я. Адпаведна, кожны кірунак вядзе свой майстар. Усяго сям'я Рымдзёнкаў сёлета мае пяць вучняў, якія ўсур'ёз жадаюць авалодаць народным рамяством, а, магчыма, у будучым прысвяціць гэтаму сваю прафесійную кар'еру.

Сам жа Сяргей глінай пачаў займацца толькі пасля службы ў арміі. І не проста капіраваць чужую тэхніку ды, як кажуць, "гнаць штампоўку", але і ствараць адметныя работы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія маюць таксама практычны характар. І калі ў Радашковічах на згаданым у адным з мінулых нумароў прадпрыемстве толькі збіраюцца запускаць у вытворчасць керамічныя жырандолі, Сяргей Рымдзёнак іх ужо актыўна прадае. Што ні кажы, а на крэатыўныя вырабы заўсёды маецца попыт, таксама як і на тэматычныя керамічныя сувеніры з надпісамі "Светлы Спас", "Шаркаўшчына" ды іншымі.

Сведчаннем жа няўрымслівага характару глінамеса і яго здольнасці вучыцца стаў уласна ганчарны круг, які майстар стварыў самастойна, выкарыстоўваючы дэталі ад матацыкла, пральнай машыны… А падгледзеў падобны апарат, як па сакрэце сказаў нам Сяргей, у метадычным цэнтры.

Ужо ад'язджаючы, мы задалі самі сабе пытанне: чым для таго ж Сяргея Рымдзёнка з'яўляецца ганчарства? Прыбытковай прафесіяй — дык заробак у тры мільёны не назавеш надзвычай вялікім. Ганчарства — гэта, хутчэй, стыль жыцця, а мо і само жыццё...

(Не)лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

Шэсць гадоў таму я сустракаўся ў Германавічах з Рымдзёнкамі: ганчаром Сяргеем і ткачыхай Ганнай. Не пастарэлі яны! Усё такія ж: вясёлыя, упэўненыя, закаханыя. А побач — бяссстрашна накручвае віражы на ровары сын, першакласнік Дзімка. Выпадкова разбіў фару на бацькавым легкавіку. Бацька не пакрыўдзіўся. А Дзімка ўжо становіцца майстрам: лепіць з пластыліну рознакаляровых і вясёлых звяроў… Не прагнуць Рымдзёнкі ні вялікіх грошай, ні гарадскога жыцця. Ім хапае ціхага вясковага шчасця. Дзеляцца ім з любым ахвотным. Нам з Кастусём, да прыкладу, падарылі па глінянай падкоўцы. Я, калі вярнуўся з камандзіроўкі, адразу прымацаваў сваю на кухоннай паліцы, дзе сабрана гліна ці не з усёй роднай Беларусі...

Кава з Адай Райчонак

Пад засенню касцёла, ля дарогі (не абмінеш!) месціцца Культурна-асветніцкі цэнтр імя Язэпа Драздовіча з унікальнай прыватнай калекцыяй жывапісу. Гаспадыня і першага, і другога — Ада Райчонак, колішняя настаўніца рускай мовы і літаратуры, аўтар-стваральнік пяці музеяў. Дарэчы, менавіта яна ў свой час паспрыяла таму, што Сяргей Рымдзёнак, колішні вучань, стаў ганчаром — нават разам ездзілі дваццаць гадоў таму на матацыкле на курсы па народных рамёствах. А пра тое, што сённяшні начальнік аддзела Людміла Стома — колішняя вучаніца нястомнай Ады Райчонак, вы ўжо ведаеце.

Пераступаючы ганак звонку звычайнага дома, немагчыма ўстрымацца ад захаплення: жывапісныя палотны, скульптуры, кнігі нібыта абступаюць цябе з усіх бакоў. Такой багатай калекцыяй, да слова, зможа пахваліцца далёка не кожны раённы краязнаўчы музей!

Прыватная галерэя была заснавана ў 2004 годзе. І прысвечана яна памяці сына Ады Эльеўны — пісьменніка, краязнаўцы, першага старшыні асветніцкага цэнтра імя Язэпа Драздовіча, выкладчыка Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта, які трагічна загінуў у 1999-м. Невыпадкова неафіцыйная назва галерэі — "Прыватны літаратурна-мастацкі музей імя Міхася Райчонка". Калекцыя складаецца з больш чым двух соцень палотнаў беларускіх мастакоў, сярод якіх можна сустрэць імёны Сяргея Цімохава, Віктара Маркаўца, Алеся Мары, Ілоны Барадулінай, Уладзіміра Сулкоўскага. Творы прысвечаны пераважна славутым асобам і мясцінам беларускай зямлі. Так, у 2010 годзе Цэнтр імя Драздовіча прысвяціў памяці Эміліі Плятар мастацкі пленэр. Усяго ж у Германавічах было праведзена два дзясяткі пленэраў, шэраг конкурсаў дзіцячых малюнкаў, лепшыя ўзоры якіх сёння можна ўбачыць у галерэі. Варта адзначыць выдатны густ і талент Ады Райчонак у стварэнні музейных экспазіцый. Асабліва ўражвае партрэт Уладзіміра Караткевіча ў поўны рост, які нібыта сустракае гасцей у адной з залаў музея.

Немалаважнай бачыцца і грамадзянская пазіцыя Ады Эльеўны, якая сваім жыццём, справамі дэманструе нашаму спажыўнаму грамадству любоў да роднай зямлі, нашай багатай культуры, беларускай мовы. Як жа можна было адмовіцца ад кубачка кавы з гэтай цудоўнай жанчынай? Бо, паўторымся, менавіта сустрэчы з такімі людзьмі, як Ада Райчонак, і ёсць сапраўднае задавальненне для журналіста…

Ада Райчонак прымае гасцей.

Сяргей і Ганна Рымдзёнкі.

Дырэктар Германавіцкага музея Людміла Навіцкая.

На людным месцы

Удзельнікі творчага спаборніцтва.

Хто сярод сельскіх лепшы?

На Касцюковіччыне прайшоў VIII Раённы фестываль народнай творчасці "Крыніца душы".

КАСЦЮКОВІЧЧЫНА

Прынялі ў ім удзел 18 сельскіх устаноў культуры. Спачатку гасцей і ўдзельнікаў прымалі ў Сялецкаўскім сельскім доме культуры, дзе ў першы дзень на сцэну па чарзе падняліся ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Сялецкаўскага, Крапівенскага, Баронькаўскага, Бялынкавіцкага, Беладубраўскага СДК, Каніцкага сельскага клуба-музея, Машаўскога і Смолькаўскага сельскіх клубаў-бібліятэк, Новасаматэвіцкага клуба вольнага часу. Добры тэмп святу творчасці задалі гаспадары сцэны. Гучалі песні ў выкананні ансамбля "Сяброўкі", якому сёлета прысвоена званне "народны".

Вельмі прыемна было чуць са сцэны вершаваныя радкі мясцовых паэтаў. Дакладна заўважылі ўдзельніцы мастацкай самадзейнасці Баронькаўскага СДК: "Кажуць людзі: якія песні?! Жыццё і так нялёгкае… Але чалавек з душой артыста спяваць будзе да апошняга!" У пацвярджэнне гэтай ісціны праспявалі аўтэнтычныя і беларускія народныя песні салісткі самага ўзроставага калектыву мастацкай самадзейнасці з Журбіна.

Прыйшлося даспадобы і выступленне ансамбля мастацкай самадзейнасці Бялынкавіцкага СДК. Відовішчным атрымаўся нумар Новасаматэвіцкага клуба вольнага часу. Беладубраўскі сельскі дом культуры прэзентаваў народны ансамбль "Белая Дуброва".

Другі святочны дзень праходзіў на ўтульнай сцэне Шарэйкаўскага СДК. Яго артысты здзівілі прафесійна адпрацаванай праграмай, вакальнымі здольнасцямі ўдзельнікаў усіх узростаў. Наступнымі на сцэну выйшлі артысты Пралетарскага СКБ. Вядучыя — Бабкі-весялухі — увесь час падтрымлівалі добры настрой у зале вясёлымі жартамі. Артысты ж Мурынборскага СДК прадэманстравалі сваё майстэрства ў выкананні эстрадных, беларускіх і рускіх народных песень. У рэпертуары фальклорнага народнага ансамбля "Чабатуха" Прусінскага клуба-бібліятэкі — толькі беларускія народныя песні.

Парадавалі яркай творчасцю ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Дзямідавіцкага СДК.

Экспазіцыя пра Першую сусветную вайну займае **чатыры залы адрамантаванага палаца Тызенгаўзаў** у Паставах.

Музей у Германавічах.

Галоўны захавальнік фондаў музея Валянціна Райчонак.

У прыватнай галерэі Германавічаў.

завяршаюцца?

Работнікі культуры пад час семінара па сакральнай тапаграфіі.

Адзін з пунктаў наведвання ўдзельнікамі семінара.

(Не)лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

Беларускія Мальдывы, край астравоў — як толькі ні называюць Браслаўскі раён, славуты на ўвесь свет сваімі сінявокімі азёрамі! Улетку дзясяткі тысяч турыстаў намагаюцца трапіць сюды. Пры гэтым шлях да "раю" для тых жа мінчан ляжыць праз Шаркаўшчыну. Чым не магчымасць добра зарабіць мясцовым культработнікам на шматлікіх транзітных турыстах? Тым больш, аб'екты, вартыя ўвагі, — у тых жа Алашках, Германавічах — маюцца. Чаго не хапае? Вядома ж, рэкламы! Чаму б не змясціць бігборды ў самой Шаркаўшчыне — якраз на павароце да Браславаў? Ці, скажам, раскласці інфармацыйныя буклеты на мясцовых аўтазапраўках? Пытанні — рытарычныя? Ці не?..

Першыя часткі журналісцкага аўтапрабегу па Докшыцкім і Шаркаўшчынскім раёнах "К"апублікавала ў №№ 39, 42.

Семінар ля Шалёнага каменя

У папярэднім артыкуле мы казалі, што нам цягам гэтай камандзіроўкі шанцавала ледзь не штодня. Да прыкладу, нечакана для сябе трапілі ў Лужкі на адкрыццё турысцка-інфармацыйнай дошкі ў гонар Бен Іегуды — вынік рэалізацыі міжнароднага праекта, ініцыяванага аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Шаркаўшчынскага райвыканкама. І вось чарговая ўдача: у раёне распачаўся выязны раённы семінар работнікаў культуры. Ягоная тэма — надзвычай цікавая: "Што такое нематэрыяльная спадчына? Аб'екты сакральнай тапаграфіі як элементы НКС". Як было не паўдзельнічаць у практычнай частцы семінара — наведанні ўнікальных не толькі для раёна, але і для краіны святыняў? Разам з Людмілай Стома далучаемся да шматлікай дэлегацыі ў Лужках ды скіроўваемся ў вёску Клінавое, дзе на старых могілках знаходзіцца праваслаўная капліча. Яе асаблівае шанаванне звязана з нерукачыннай іконай святога Міколы Цудатворцы. Паводле аповедаў мясцовых жыхароў, абраз з яскрава адлюстраванай выявай святога з'явіўся на камлі дрэва, пасля чаго пачалося яго ўшанаванне, а з цягам часу была зроблена і каплічка, якая засёды адкрыта для вернікаў.

Акрамя гэтай святыні ў Шаркаўшчынскім раёне можа прываблівацъ турыстаў (ужо нават самой назвай) так званы "Шалёны камень Грыдзюшчынскі", "Святая ліпка" ў вёсцы Дворнава ці той жа "Вялікі камень Дубакоўскі" ў Дубоўцы. Іншая справа, што, у адрозненне ад самадастатковых палацаў ды храмаў, аб'екты нематэрыяльнай спадчыны патрабуюць добрага транслятара — чалавека, які мог бы грунтоўна патлумачыць гасцям раёна гісторыю і традыцыі ўшанавання таго або іншага элемента НКС. Але на сённяшні дзень ці не галоўная задача культработнікаў раёна — надаць выяўленым элементам спадчыны статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Спачатку — вобласці, а пасля — краіны, ды, магчыма, нават UNESCO. І, вядома ж, важна спрыяць захаванню і папулярызацыі знойдзеных скарбаў нашай духоўнай культуры. Думаецца, гэта і без нашых падказак ведаюць у Шаркаўшчынскім раёне…

Агульнае (не)лірычнае заканчэнне

Шкада, але пра Шаркаўшчыну — усё. Праведалі старых сяброў, займелі новых. Наеліся да адвалу яблыкаў неверагоднага смаку і яшчэ раз пераканаліся: калі стаялі б грошы ў нашай справе на першым месцы, не было б і справы. А робяць яе людзі, жыццёвы прынцып якіх даволі просты: "Калі не я, дык хто?". На такіх і свет трымаецца…

К

Артысткі Валаськаўнянскага СДК прадэманстравалі майстэрства ў выкананні беларускіх традыцыйных песень. А колькі талентаў паказалі артысты з вёсак Забычанне, Муравілле, з Тупічанскага СДК!..

Наталля ДРОБЫШАВА,
намеснік дырэктара Цэнтралізаванай клубнай сістэмы Касцюковіцкага раёна
Фота Людмілы СМАЛЯКОВАЙ

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby, odnoklassniki.ru/group/52156879339702**

Па дзевяці маршрутах

Цяжка сказаць, якім было б жыццё ў аддаленых і маленькіх населеных пунктах нашага раёна без, напрыклад, аўтакрамы, перасоўнай пошты… А што рабіць, калі хочацца пачытаць новую кнігу, пагартаць часопіс, а бібліятэкі паблізу няма? У такіх выпадках жыхарам Маларытчыны на дапамогу прыходзіць бібліобус, або, як яго яшчэ называюць, бібліятэка на колах. Без яе вясковы побыт цяпер ужо і ўявіць цяжка.

МАЛАРЫТЧЫНА

Бібліятэкар бібліобуса Наталля Ківачук прапаноўвае Варвары Сай з вёскі Добрае кніжныя навінкі.

Па словах бібліятэкара перасоўкі Наталлі Ківачук, аўтабібліятэка-філіял Маларыцкай ЦБС абслугоўвае 23 населеныя пункты: гэта 341 чытач, з іх 48 — дзеці. Звычайна бібліобус выязджае ў рэйс тры разы на тыдзень. Распрацаваны і зацверджаны графік дзевяці маршрутаў руху. У 22 вёскі раёна перасоўка заязджае раз на месяц, а вось у Сушытніцу — два разы. Асноўная прычына, як тлумачыць Наталля Ківачук, у тым, што там пражывае амаль 400 чалавек, многія з якіх з'яўляюцца актыўнымі чытачамі. Нарасхват ідуць кнігі і ў вёсках Нікольская, Горы. Штомесяц кнігавыдача вагаецца ў межах ад 700 да адной тысячы экзэмпляраў. У фондзе бібліобуса — 2 750 кніг. Таксама перасоўная бібліятэка выпісвае 21 часопіс, 4 з іх — для дзяцей.

Попытам карыстаецца літаратура духоўнай тэматыкі, замежныя раманы, творы класікаў беларускай і рускай літаратуры. Для зручнасці чытачоў прадугледжана паслуга "Кніга пад заказ". Можна замовіць неабходную кнігу і ў наступны раз атрымаць яе. Большую частку сваіх чытачоў бібліятэкар бібліобуса абслугоўвае дома, бо па стане здароўя ці з прычыны занятасці многія з вяскоўцаў не могуць падысці да месца стаянкі бібліятэкі на колах.

Нядаўна мы разам скіраваліся па маршруце Вотчын — Добрае — Перавое. У першай вёсцы мы затрымаліся ненадоўга. Быў будні дзень. Вяскоўцы жылі сваімі восеньскімі клопатамі, таму чытачоў прыйшло мала. А вось ў Добрым знаходзіліся столькі часу, колькі прадугледжваў графік. Бібліобус, праязджаючы па вёсцы, гучна сігналіць і спыняецца пасярод вуліцы. Адной з першай абмяняць кнігі падыходзіць Варвара Сай. У свае 75 гадоў яна актыўная чытачка.

Праз некалькі хвілін да бібліобуса з падворкаў пацягнуліся і іншыя вяскоўцы. Наталля Міхайлаўна добра ведае "кніжныя" густы сваіх чытачоў, таму адразу прапаноўвае патрэбную літаратуру.

У Перавым перасоўная бібліятэка таксама затрымалася надоўга. Наталля Ківачук адразу называе адрасы, куды неабходна заехаць абавязкова.

…Многія вяскоўцы прызналіся, што каб не заязджаў да іх бібліобус, дык, верагодна, яны і не чыталі б кнігі, а каб і чыталі, то рэдка ды мала…

Мікалай НАВУМЧЫК
Фота аўтара

8 — 9 лістапада пройдзе II Музычны фестываль **"Гучаць старадаўнія арганы Пастаўшчыны"** імя Браніслава Руткоўскага.

Тактыка культурнага развіцця

У Надзеі ёсць надзея

Даведаўся і парадаваўся: пасля двухгадовага рамонту 27 верасня адкрыўся Хоцімскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей. Даўно там не быў. Патэлефанаваў і дазнаўся, што два супрацоўнікі (столькі іх пасля аптымізацыі) заняты з экскурсантамі, а кіраўнік Надзея Барадзіна паехала ў Магілёў па дамову аб камерцыйнай выстаўцы. Музей працуе напоўніцу, у тым ліку — і на перспектыву.

Яўген РАГІН

Тут да месца згадаць Дзяржпраграму "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады. Гэта дзякуючы ёй за 1 мільярд рублёў у Хоцімску быў адрамантаваны музей, створаны новыя экспазіцыі, на 150 мільёнаў — закуплена 18 карцін сучасных мастакоў Магілёўшчыны… У абноўленых залах з'явілася годнае асвятленне. "Сталі бачныя экспанаты!" — радуецца Надзея Сцяпанаўна. Расіяне зацікавіліся новай жывапіснай калекцыяй Хоцімска — пазначыліся пэўныя сумесныя перспектывы. Словам, мясцовыя музейшчыкі, цудоўна ведаючы, што закладзеныя ў Дзяржпраграму грошы — не банкаўскі рахунак, хуценька іх забралі і эфектыўна асвоілі… Усім бы так!

Але ў выніку размовы з дырэктарам установы высветлілася, што музей ажыў неканчаткова. Адпушчанага дзяржавай мільярда аказалася мала. Як вядома, цягам апошніх гадоў фінансавы складнік згаданай Дзяржпраграмы крыху, мякка кажучы, відазмяніўся. Урэшце, яна — далёка не адбітак няўхільнага фінансавага развіцця, а, хутчэй, доказ таго, што эканоміка нашай нацыянальнай культуры яшчэ толькі фарміруецца. Бессістэмна і непрадказальна. Але не толькі пра гэта гаворка.

Музей у Хоцімску знаходзіцца ў двухпавярховым будынку колішняга знакамітага гарбара Пятра Камнева. На першым паверсе была майстэрня, на другім — жылыя памяшканні. Менавіта ў апошніх і месцяцца экспазіцыі. На канчатковы рамонт першага паверха грошай не хапіла. А тут Надзеі Барадзіной хацелася б стварыць у перспектыве пакой побыту вядомага рамесніка. Жывыя ягоныя нашчадкі, сёе-тое можна прыдбаць у іх, штосьці — у антыквараў. Справа — не танная. Між тым, музей за гісторыю існавання (першая часовая экспазіцыя адкрылася ў 1998 годзе) не атрымаў на набыццё экспанатаў ні рубля. Раённых музейшчыкаў гэтым фактам я, напэўна, таксама не здзівіў. Вялікіх грошай няма і не будзе. Прынамсі, за проста так іх цяпер не здабудзеш.

А дзеля "не проста такога" фінансавага апекавання патрэбна мець праект з дакладным эканамічным абгрунтаваннем і ведаць, каго ўсім тым зацікавіць… Інакш кажучы, штосьці даўно мы пра фандрайзінг не пісалі. А тым часам на развіццё музеяў, бібліятэк ды клубаў аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Рагачоўскага райвыканкама асвоіў каля 400 тысяч еўра "грантавых" грошай, што пайшлі на рэалізацыю ці не паўдзясятка адметных творчых праектаў. Калі хто не ведае, нагадаю, што Рагачоўскі раён не мяжуе з Прыбалтыкай, Польшчай ці Расіяй. Тым не менш, даўно адчуў трансгранічныя сувязі. Так што на курсы перападрыхтоўкі варта ехаць не толькі ў Інстытут культуры Беларусі. Апрача Рагачова можна наведаць Ашмяны ды Смаргонь, дзе таксама навучыліся здабываць грошы… Але, я перакананы, адрасоў неўзабаве паболее.

Вось тут хоцімскім музейшчыкам, як той казаў, і карты ў рукі . Яны і два "рамонтныя" гады выязджалі з выстаўкамі ў школы, сельскія клубы, аграгарадкі... А пачаўшы з чыстага ліста, цягам месяца пасля адкрыцця абноўленай установы прапанавалі суражскім калегам (Браншчына) сумесны праект, звязаны з развіццём сучаснага жывапісу. А побач жа яшчэ і Смаленшчына. І ўвогуле, дырэктар Хоцімскага музея Надзея Барадзіна — аптымістка, бо прафесіянал. Упэўнена, што той, хто дзяржаўныя грошы на рамонце паспяхова асвоіў, мае карт-бланш даверу не толькі ў раённага кіраўніцтва. Так што музей без пакоя Камнева не абыдзецца. А з такой візітоўкай можна і прастору далёкага замежжа асвойваць!..

К

Давялося мне выступіць на навукова-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай радаводу Лапацінскіх (Сар'я — Лявонпаль, 28 — 29 мая). А летам 1999 г. у Верхнядзвінску праходзіла I Рэгіянальнае свята мастацтваў Прыдзвіння "Дзвіна — Двина — Daugava". У сваім музеі "насыціў" экспанатамі выстаўку, прысвечаную Янісу Райнісу: паспрыяла гэтаму праца вучоным сакратаром Літаратурнага музея Янкі Купалы. А ў 1999 годзе калегія ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама прысвоіла званне "народны" музею-сядзібе "Хата бабкі Параскі" Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Верхнядзвінскага раёна" — за дасягненні па набыцці і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны.

ТЭКСТ

Сяргей ПАНІЗНІК,
паэт, стваральнік музея "Хатка бабкі Параскі. На шляху з грэкаў у варагі"

Там, дзе грэкі ішлі ў варагі...

Іскрынкі з гасцявой кнігі **прыватнага вясковага музея**

Першыя сустрэчы года двухтысячнага

У пачатку красавіка 2000 года я быў запрошаны ў Шайцераўскую школу на літаратурную вечарыну, прысвечаную творчасці земляка Тараса Хадкевіча. Адтуль у Цінкаўцы ніхто не трапіў, затое 3 красавіка Гасцявая кніга папоўнілася каштоўным запісам: *"Тое, што мы пабачылі ў гэтай цудоўнай хаце, у гэтым Музеі, вартае нашых самых дарагіх беларускіх святыняў!!! Тут жыве душа Беларусі, асвечаная любоўю і плёнам гэтай любові, вялікім плёнам! Вечна жыць гэтаму жывому Дому!*

Галіна Дзягілева (Беларускі паэтычны тэатр "Зьніч")."

У маі 2001 года пакінулі аўтографы ўдзельнікі 2-й экспедыцыі па Дзвіне-Даўгаве (капітан Юрый Копасаў з Даўгаўпілса). А 17 чэрвеня Цінкаўцы наведалі Людміла Хмяльніцкая з Віцебска і Вітаўт Ермалёнак з Міёраў — даследчыкі роду Лапацінскіх. Ёсць у мяне здымак, дзе побач з імі стаіць сям'я Лапацінскіх з Сігулды. Вазіў я латыша Рыхарда ў Лявонпаль, каб ён узяў жменьку зямелькі з-пад сцен палаца беларускага Лапацінскага.

Многія старонкі Гасцявой кнігі трэба перакладаць: тэксты напісаны на англійскай, нямецкай, латышскай, літоўскай мовах. Затое японец Косіна Го сам пераклаў уласнае пасланне на рускую і беларускую мовы. А вось такія дзівосныя радкі і перакладаць не варта: *"Мы, вокально-хореографический ансамбль из г. Десногорска, очень рады, что есть люди, которые так бережно хранят культурное наследие великого братского белорусского славянского народа. 02.06.2002 г."*. І каля трыццаці расіян падпісаліся пад гэтымі словамі…

У лютым 2003-га ў раёне адзначалі 60-годдзе Асвейскай трагедыі. Я прыехаў з укладзенай мною кнігай народнай памяці "Дзеці вайны". У тым жа годзе мне было нададзена званне Ганаровага грамадзяніна Асвеі. А 2004-ы зноў быў юбілейным для музея: споўнілася 25 зімаў і летаў з той пары, як я, пераступіўшы парог хаты бабкі Параскі, убачыў прысценны ручнік-абярэг. У вышытых сюжэтах — памяць русалляў XI — XII стагоддзяў. Ідыяграма вады — знак з эпохі неаліту. Зырчэлі выявы Берагіні, Вясны-Лады. Гэты ручнік "перанёсся" потым на вокладку майго зборніка "Пры сьвячэньні…"

10 мая 2004-га сябры "Клуба цікавых сустрэч" (кіраўнік — Людміла Гагалінская) весела адзначылі ў Цінкаўцах 25-годдзе музея-сядзібы. Не маркоцілася хатка і ў жніўні таго ж года. Пажадалі *"…значных поспехаў у развіцці музея і творчасці аўтара"* А.Муха з Еўпаторыі, Л.Абуховіч і М.Абуховіч з Наваполацка, сям'я Мухаў з вёскі Баліны.

У сакральнай хаце

Адчувальным быў дотык ласкі не толькі з Еўпаторыі. Аляксандр Аўсяннікаў і Уладзіслаў Перац у жніўні перадалі паклон з Санкт-Пецярбурга і Ельца: *"…Успомнілі карані свае, удыхнулі часцінку беларускай духоўнасці"*.

А 5 верасня 2004 г. паэтка Наталка Пазняк з Кіева была зачаравана прыберагам Дзвіны:

…Як смачна пахне хлеб
На ручніку Параскі.
Калі — камін пячэ,
А поруч — добрі друзі,
Размову ткаць лягчэй:
Мы — як чмялі на лузе.

Усе госці былі ўдзячныя Міхасю Скоблу за аўтапрабег па Прыдзвінні, бо змаглі наведаць і яшчэ адзін мой музей — у Лявонпалі…

Доўга самоцілася на стале Гасцявая кніга. З апошніх запісаў просяцца словы пра тое, што 30 верасня 2008 года Л.Лямневіч, В.Фесіна, Р.Бабашка ад імя ўдзельнікаў семінара арганізатараў адукацыі Віцебскай вобласці пажадалі: *"…Росквіту музею, цікавых гасцей, натхнення, здароўя, новых плённых сустрэч!"*.

Новыя сустрэчы — былі. Былі і перамовы з паважанымі асобамі раёна. Але не было ўхвалена маё памкненне перадаць у дарунак раёну музейную сядзібу, каб было каму апекавацца цікавымі наведвальнікамі, плённымі сустрэчамі на тысячагадовым шляху з грэкаў у варагі.

З ручніком-абярэгам бабкі Параскі святкую 35-годдзе музея і прамаўляю на кужаль: "Берагіня — Вялікая Багіня Маці-Зямля-Карміцелька! Вясна-Лада! Удзячны вам і Уладару Нябёс за асвячэнне абдоймаў з Айчынай, да якой прытуляліся вашыя і мае госці. Не змаркоцімся ў незабыўнасці".

ф о т а ф а к т



Навагрудскі абрыс

Фота са старонкі Навагрудскага турысцка-інфармацыйнага цэнтра гэтым тыднем абляцела ўвесь Байнэт і спарадзіла бурныя дыскусіі. Як бачым, выгляд Касцельнай вежы замка ў старадаўняй сталіцы Вялікага Княства Літоўскага страціў знаёмыя абрысы і прырос новай цэглай. Чаму менавіта так было вырашана зрабіць кансервацыю? Чытайце пра гэта ў наступных нумарах "К".

Кажуць эксперты

Ларыса ВАЙНОЎСКАЯ,
дырэктар Краязнаўчага музея імя І.Д. Чэрскага ў аграгарадку "Валынцы" Верхнядзвінскага раёна:

— "Хатка бабкі Параскі" — музей надзвычай цікавы, бо матэрыял сабраны багаты і грунтоўны. Мне, да прыкладу, усё вельмі спадабалася. Тут выснова, падаецца, адзіная: чым больш музейных устаноў у краіне, тым лепш. І якая розніца, дзяржаўныя яны ці прыватныя? Адну справу робім, урэшце. Таму дзяржава павінна ўвагу звяртаць і на прыватныя праекты.

На мой погляд, "Хатку бабкі Параскі" трэба крышачку добраўпарадкаваць, каб больш выгадна прэзентаваць кожны з экспанатаў — менавіта з прафесійнага пункта гледжання. Усё ж шаноўны Сяргей Панізнік — не музейшчык, а паэт. Урэшце, чым адметнае дзяржаўна-прыватнае партнёрства? Узаемавыгаднай зацікаўленасцю!..

Аляксей МІЦЮКОЎ,
дырэктар Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея:

— Як я стаўлюся да прыватных музеяў? Калі чалавек, згодна з Законам аб музеях і Музейным фондзе, мае калекцыю прадметаў музейнага значэння, якую ён гатовы экспанаваць, і можа стварыць усе ўмовы для яе захавання ды аховы, створыць надзейнае фондасховішча, калі памяшканні адказваюць інструкцыйным патрабаванням, а канцэпцыя прыватнай экспазіцыі — нестандартная і прывабная для ўсіх, калі ўсё гэта мае месца — я за такія музеі галасую абедзвюма рукамі! Чаму б, сапраўды, і не?..

У Брэсцкай вобласці такіх праектаў пакуль няма. Але я гатовы прадаставіць любому ахвотнаму грунтоўную метадычную дапамогу. Паўтаруся, што ўмова для нашага ўзаемадзеяння адзіная: годная, цікавая ды карысная канцэпцыя будучага музея…

Алена НОВІКАВА,
дырэктар Чачэрскага гісторыка-этнаграфічнага музея:

— Дзяржаўны і прыватны музеі павінны быць не канкурэнтамі, а партнёрамі. Лічу, што прыватныя музеі павінны з'яўляцца. Хаця б з той нагоды, што прыватныя калекцыі на сёння вельмі запатрабаваны. Вось і пункт сутыкнення інтарэсаў. Наша ўстанова, напрыклад, пастаянна супрацоўнічае з прыватнымі калекцыянерамі, з гатоўнасцю прадастаўляе для іхніх экспазіцый свае плошчы.

Не кожны з такіх аматараў цікавостак пакуль ідзе на кантакт. Нават грошы іншым разам абяцаем, але камусьці сорамна, а хтосьці проста не хоча падобнай незвычайнай рэкламы. Калі ж удаецца прыцягнуць такога прыватніка да супрацоўніцтва, то прэзентацыя ягонай калекцыі заўжды становіцца музейнай удачай!..

Пра гасцявую кнігу свайго музея Сяргей Панізнік пачаў апавядаць у "К" № 44. Сёння — заканчэнне артыкула і каментарыі экспертаў адносна ўзаемадзеяння дзяржаўных ды прыватных музеяў.

Да 21 лістапада ахвотныя могуць падаць заяўкі на ўдзел у нацыянальным адборы да конкурсу **"Еўрабачанне-2015"**.

Хэдлайн рэгіёна

Што паўстане на грант?

Гаворка — пра музей, які будзе знаходзіцца на тэрыторыі раённага Музейнага комплексу Напалеона Орды ў вёсцы Варацэвічы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Як пісала раней "К", музей ствараецца ў рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі "Трансгранічныя цэнтры дыялога культур у Лосіце і Варацэвічах", які, у сваю чаргу, з'яўляецца часткай Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва "Польшча — Беларусь — Украіна". Установа культуры стане першым паўнавартасным музеем вядомага мастака і музыканта на тэрыторыі Беларусі.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Станоўчыя прыклады трансгранічнага супрацоўніцтва беларускіх музеяў можна доўжыць. І ўсе яны яшчэ і яшчэ будуць казаць аб тым, што грашовая дапамога з боку замежных партнёраў на адбудову ці абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы музейных устаноў паступова робіцца ў нас завядзёнкай.

І гэта цалкам заканамерна, бо, як вядома, бюджэтнае фінансаванне не заўсёды здольнае забяспечыць усе пажаданні музейных супрацоўнікаў у рэгіёнах краіны. У сувязі з чым трансгранічнае супрацоўніцтва ў музейнай — ды, мабыць, не толькі ў музейнай — сферы, пра якое раней ведалі ў раёнах вельмі мала, цяпер выходзіць на першы план.

Так, для таго, каб атрымаць грант, трэба парупіцца: прыдумаць і напісаць заяўку, прычым на англійскай мове, наладзіць сувязь з грантадаўцамі, папаездзіць "па Еўропах"… Але высілкі таго вартыя. Бо ў выніку музейная ўстанова можа займець найноўшае тэхнічнае абсталяванне, уключыцца ў міжнародны турыстычны праект, стаць больш вядомай не толькі ў Беларусі, але і ў суседніх краінах, што, натуральна, непасрэдна паўплывае на наведвальнасць ды запатрабаванасць таго або іншага музея…

У Польшчы, Літве, Латвіі ды іншых краінах Еўрасаюза падобная трансгранічная практыка — даўняя. Беларусы цяпер фактычна ідуць следам за сваімі калегамі, прычым даволі паспяхова… Цікава, пра які чарговы праект раённага музея "К" напіша наступным разам? Можа, менавіта пра ваш?

К

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby, odnoklassniki.ru/group/52156879339702**

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Экскурсія ў фармаце он-лайн

"Віртуальны" і рэальны тур па музейных запасніках

Паведамленні пра музейныя праекты, зробленыя сумеснымі намаганнямі спецыялістаў з розных краін на гранты Еўрапейскага саюза або Праграмы развіцця ААН, ужо сталіся ў нашай газеце звыклымі. Згадаю хоць бы адзін такі прыклад, пра які "К" пісала не так даўно: Гудзевіцкі літаратурна-краязнаўчы музей, што ў Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці, атрымаў пад свой праект каля 200 тысяч еўра і цяпер можа пахваліцца новай экспазіцыяй ды сучасным тэхнічным абсталяваннем у музейных залах…
Так, Гродзеншчына ў гэтым плане — рэгіён унікальны: міждзяржаўныя сувязі тут — сталыя ды моцныя, а праекты ладзяцца літаральна ў кожным раёне і ў розных сферах — пачынаючы ад сяброўства на ўзроўні народных калектываў ды заканчваючы міжнароднымі фестывалямі і сумеснымі праектамі. Але ж і ў самім Гродне не спяць у шапку. Напрыклад, у літаратурным аддзеле Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея (так цяпер называецца былы Музей імя Максіма Багдановіча пасля рэарганізацыі ўстановы) сёння завяршаецца праект па адной з праграм трансгранічнага супрацоўніцтва. Натуральна, прайсці міма падобнага досведу нельга…

Наведвальнікі музея спрабуюць павандраваць па віртуальных залах.

Святлана РАПЕЦКАЯ, навуковы супрацоўнік літаратурнага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, каардынатар Праекта трансгранічнага супрацоўніцтва

Са сваёй ідэяй стварэння віртуальнага Музея Максіма Багдановіча Святлана Рапецкая выступіла на форуме, які ладзіўся ў рамках Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва "Латвія — Літва — Беларусь" у Вільнюсе. Там яна і пазнаёмілася з будучымі партнёрамі па праекце — супрацоўнікамі Латгальскага культурна-гістарычнага музея з горада Рэзэкнэ (Латвія) і Кедайняйскага краязнаўчага музея (Літва).

— Гэта першая спроба ў нашай краіне такім чынам прадстаўляць музей і музейныя фонды, — распавядае далей Святлана Рапецкая. — Бо, як вядома, часцей за ўсё працуе пастаянная экспазіцыя, часовыя выстаўкі, але ёсць і шмат вельмі цікавых прадметаў, што папросту ляжаць у фондах, і іх, на жаль, ніхто не бачыць. А ў нас зараз — пасля рэалізацыі праекта — ёсць магчымасць віртуальна ўбачыць усе багацці, якія мае наша ўстанова…

А паказаць у Музеі Багдановіча сапраўды ёсць што. Сярод самых каштоўных экспанатаў — два арыгінальныя асобнікі зборніка вершаў "Вянок", метрыкі брата Максіма Багдановіча Льва і яго сястры Ніны, шкатулка, якую падарыў бацька паэта сваёй жонцы, сямейныя фатаграфіі і лісты... Цяпер усё гэта можа пабачыць кожны чалавек нават не выходзячы з дому. Прычым тое могуць зрабіць не толькі жыхары Беларусі, але і любыя наведвальнікі з іншых краін свету праз сайт.

Ад задуманага да рэальнага

Але гэта было пазней. А тады, вярнуўшыся з форуму і папрацаваўшы над усімі неабходнымі паперамі ды пераклаўшы свае матэрыялы на англійскую мову, Святлана Рапецкая накіравала іх на конкурс, абвешчаны грантадаўцамі. І станоўчы адказ не прымусіў сябе чакаць. Вось так, пачынаючы з 2012 года Музей імя Максіма Багдановіча ў Гродне стаў адным з партнёраў міжнароднага праекта "Віртуальнае мінулае — залог поспеху будучыні музеяў", які ладзіўся ў рамках Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва "Латвія — Літва — Беларусь".

Збегчы ад статус-кво

Расповед пра наведанне ўстановы пачну са знаёмства з галоўным каардынатарам праекта трансгранічнага супрацоўніцтва Святланай Рапецкай. Цяпер яна займае пасаду навуковага супрацоўніка, а раней была дырэктарам Музея імя Максіма Багдановіча.

— На жаль, сёння многія сучасныя музеі ўспрымаюцца як нейкія статычныя ўстановы, куды ходзяць толькі школьнікі ды пенсіянеры, — распачала нашу гутарку Святлана Рапецкая. — Мяне заўсёды хвалявала гэтае пытанне, таму захацелася нейкім чынам змяніць гэты прыкры статус-кво, даць музею новае жыццё, прыцягнуць увагу сваімі ноу-хау не толькі наведвальнікаў малодшага школьнага ўзросту...

Кажа эксперт

Людміла ЛЕБЕДЗЬ, галоўны спецыяліст упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь:

— Музеі Гродзеншчыны паспяхова супрацоўнічаюць з міжнароднымі арганізацыямі. Можна згадаць тыя ж Гудзевічы, а таксама Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей. Апошні ўжо доўгі час удзельнічае ў трансгранічным праекце "Маршруты па штэтлах. Аб'екты яўрэйскай культурнай спадчыны ў трансгранічным турызме", які фінансуецца Еўрасаюзам у рамках Праграмы "Польшча — Беларусь — Украіна". На маю думку, сёння трапіць у падобныя праекты не так ужо і цяжка — варта толькі прапанаваць замежным партнёрам сапраўдны годны ды цікавы праект. А з перакладам на англійскую мову ўсіх патрэбных дакументаў і матэрыялаў могуць дапамагчы як арганізатары, так і партнёры па праекце. Як, дарэчы, і з планам напісання заяўкі. Да таго ж, звычайна пэўныя схемы напісання праекта прапануюцца самімі грантадаўцамі. Акрамя таго, не варта забываць і пра тое, што партнёры зазвычай сустракаюцца паміж сабой, абменьваюцца ідэямі, дапамагаюць адно аднаму...

Шкатулка, якую падарыў сваёй жонцы бацька Максіма Багдановіча.

Што даў удзел у гэтым праекце гродзенскай установе культуры? Натуральна, новыя магчымасці па прыцягненні наведвальнікаў. Напрыклад, на ўваходзе ў музей сёння кожны госць адразу бачыць інфакіёск з сэнсарным LED-экранам. З яго дапамогай можна павандраваць па ўсіх трох музеях — беларускім, латышскім і літоўскім, — а таксама пагуляць у спецыяльна распрацаваныя для школьнікаў камп'ютарныя гульні.

— Справа ў тым, што ў рамках праекта мы задумалі гульню пад назвай "Дом з таямніцамі". У яе можна гуляць он-лайн або спампаваць на планшэт ці мабільны тэлефон, — патлумачыла Святлана Рапецкая. — Гуляючы, школьнікі, студэнты, наведвальнікі могуць азнаёміцца з дзяцінствам і гродзенскім перыядам жыцця паэта, гарадскім асяроддзем таго часу. У аснове гульні — матэрыялы гродзенскага музея, біяграфічныя звесткі пра Максіма Багдановіча, ягоную творчасць… Пагадзіцеся, гэта больш цікава, чым проста аглядаць пакоі мемарыяльнага дома ды слухаць расповеды экскурсавода…

Дарэчы, пагуляў у гэтую гульню і я. Падарожнічаючы па віртуальных музейных залах, разгадаў нямала загадак, звязаных з біяграфіяй Максіма Багдановіча, а на апошнім, самым "складаным", узроўні змог пазнаёміцца "ўжывую" з усёй сям'ёй класіка беларускай літаратуры. Так што магу з упэўненасцю сказаць, што дадзеная гульня разлічана не толькі на школьнікаў…

Да слова, гэта не адзіная забаўка, якую прапануюць наведвальнікам у музеі. Справа ў тым, што кожны ўдзельнік праекта з Беларусі, Латвіі і Літвы распрацаваў сваю ўнікальную гульню. І ў іх сёння таксама можна пагуляць кожнаму пры дапамозе таго ж сэнсаранага экрана. Напрыклад, музей з Латгаліі прываблівае "Гліняннымі пераўтварэннямі", а музей Кедайняя прапануе наведвальнікам "узнавіць дом Арнетаў"… Падрабязней пра гэтыя гульні распавядаць не буду — адсылаю кожнага ахвотнага на сайт праекта…

Змены — навідавоку

Але ж, вядома, сэнсарным экранам ды стварэннем сайта змены не абмежаваліся. Дзякуючы сродкам, атрыманым паводле гранта, у будынку на вуліцы 1 Мая была таксама ўсталявана акустычная сістэма і цалкам абноўлена экспазіцыя "Гродзеншчына літаратурная".

Цяпер наведвальнікі ўстановы культуры могуць пад час экскурсіі паслухаць у запісе вытрымкі з перапіскі Максіма Багдановіча з ягонай маці ды бацькам, а ў дзіцячым пакоі для іх прагучыць не толькі расповед экскурсавода, але і знакамітая казка "Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык". Кіруе аўдыясістэмай экскурсавод, які ўключае яе ў патрэбны час… Што да абноўленай экспазіцыі "Гродзеншчына літаратурная", дык яна на сёння сабрала рукапісы, фатаграфіі, кнігі, асабістыя рэчы Васіля Быкава, Ларысы Геніюш, Міхася Васілька і Дануты Бічэль…

Наастачу варта сказаць, што амаль уся сума на рэалізацыю праекта была атрымана гродзенскім музеем з Фонду Еўрасаюза. А гэта ні многа, ні мала — каля 90 тысяч еўра. Да таго ж, амаль 9 тысяч еўра, згодна з умовамі гранта, былі таксама выдаткаваны з абласнога бюджэту. Чым не станоўчы прыклад для пераймання і дзеяння для ўсіх іншых музеяў у розных рэгіёнах краіны? А па парады раю звяртацца да Святланы Рапецкай: чаго-чаго, а крэатыўнага досведу ёй не займаць…

К

Наш ансамбль "Класік-Авангард" і гурт "Балотныя кавалеры" (Польшча) — удзельнікі праекта **"Зерне"** ў Белдзяржфілармоніі 5 лістапада.

Іх фольк

Калі вы лічыце, што фальклор у сучасным горадзе — гэта нешта цікавае старэйшаму пакаленню, то, мабыць, маеце на ўвазе Германію. Калі мяркуеце, што фальклорны рух — маладзёжная субкультура, то, хутчэй за ўсё, вам знаёмыя беларускія і польскія рэаліі. Калі з фальклорам у вас асацыююцца дзяржаўныя святы ды вялікія фестывалі на адкрытым паветры, то вы згадваеце Прыбалтыку. У Скандынавіі ж носяць народныя строі на дзяржаўныя і сямейныя ўрачыстасці, але фальклорная музыка не мае велізарнай папулярнасці, як у Літве ды Латвіі. Польскія і шведскія рэаліі прапаную параўнаць на прыкладзе двух фестываляў.

Гурт "Дычка" з Польшчы мае зусім не аўтэнтычныя строі.

Гурт "Залаты ўзрост" з Калінкавіччыны.

А гэта — прадстаўнікі шведскага фольк-гурта.

ШВЕЦЫЯ, ПОЛЬШЧА

Ліншопінг

Тут фэст штогод праходзіць у сярэдзіне кастрычніка. Гэта горад з насельніцтвам каля ста тысяч чалавек, цэнтр правінцыі. Арганізуе фестываль мясцовая суполка аматараў фольк-музыкі (такія ёсць амаль у кожным буйным, па шведскіх мерках, горадзе) разам з Інстытутам

ТЭКСТ

Алена ЛЯШКЕВІЧ,
метадыст аддзела навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі

Эрыка Сальстрома Нацыянальнага цэнтра фольк-музыкі ў Тобу. Апошняя арганізацыя цікавая тым, што названа ў гонар носьбіта фальклору. Эрыка Сальстром (1912 — 1986), музыкант і кампазітар, папулярызаваў у якасці "ўласна шведскага" інструмента нікельхарпу ("арфу з ключамі"). Па-другое, Інстытут — гэта адна з дзвюх недзяржаўных арганізацый у Швецыі, якія маюць статус кансультанта пры UNESCO па нематэрыяльнай культурнай спадчыне. Нагадаем, што ў Беларусі арганізацыя з такім статусам адна — Студэнцкае этнаграфічнае таварыства.

Для імпрэзы абіраюць будынак ці комплекс будынкаў з мноствам памяшканняў, адно з якіх адводзіцца пад танцы, адно — пад глядзельную залу, выступленні вядомых гуртоў. Астатнія памяшканні — камерныя, разлічаныя на невялікую аўдыторыю, ператвараюцца з танцпляцоўкі ў глядзельную залу. Тэрыторыя фестывалю абгароджваецца, пакідаецца толькі адзін уваход.

Білет на два дні каштуе 500 крон (трохі больш за 50 еўра). Гэта нямала нават для шведаў. Але складаецца ўражанне, што добрая палова публікі — самі выканаўцы. Яно і не дзіва, улічваючы, што на сцэне адначасова можа стаяць і два, і дваццаць чалавек, а за час фэсту выступіла каля пяцідзесяці гуртоў.

Па маім досведзе наведвання фестываляў, шведскі фальклорны рух — танцацэнтрычны. Спяваюць гурты мала, нейкіх элементаў тэатралізацыі няма. На імпрэзах, дзе даводзілася бачыць шведскія фольк-гурты за мяжой, таксама ўключалі ў праграму танцы.

Сёлета ў Ліншопінгу было шмат гуртоў з так званых вышэйшых народных школ. У іх чалавек любога ўзросту можа атрымаць дадатковую адукацыю па розных профілях, у тым ліку па мастацтве, рэканструкцыі прадметаў побыту вікінгаў, любым кірунку музыкі і танца. У вышэйшых народных школах моладзь часта рыхтуецца пасля гімназіі да паступлення ва ўніверсітэт пэўнага профілю. Такія "праграмы па інтарэсах" доўжацца найчасцей адзін навучальны год. Практычна ўсе вышэйшыя народныя школы прапануюць таксама "агульны курс", што дубліруе праграму гімназіі, для тых шведаў, якія з нейкай прычыны не давучыліся ці атрымалі кепскі атэстат (тут школьныя адзнакі ўлічваюцца пад час паступлення ва ўніверсітэт). Вучацца на "агульных курсах" і эмігранты, якія хочуць пацвердзіць дыплом, атрыманы дома, ды здаць дзяржаўны іспыт па шведскай мове. Ансамблі вышэйшых народных школ ужо на другім месяцы навучання выступаюць прыстойна.

Што мяне найбольш здзівіла — на сцэну маглі выйсці пяць-дзесяць чалавек са скрыпкамі, больш ніякіх інструментаў, цэлую гадзіну граць польскі (від танцавальных мелодый), і мне, чалавеку, для якога шведскі фольк "не свой", слухаць гэта не сумна. У той час як на польскіх фальклорных канцэртах не магу доўга сядзець: рэжуць вуха гэткія "чужыя" спевы і музыка (не кажучы пра тое, што любы фольк у чыстым выглядзе цяжка слухаецца, нават свой, родны). Ад пачатку традыцыйная музыка не разлічана на камунікацыю выканаўца-слухач — усе прысутныя станавіліся ўдзельнікамі. Вось і сучасныя шведы, пакуль музыкі гралі, імкнуліся танчыць, калі была магчымасць. Выступленні пачыналіся а пятай гадзіне вечара і працягваліся да трэцяй ночы, а танцоры ўсё не стамляліся! Фестываль праходзіў два дні. З раніцы ладзіліся майстар-класы па танцах, спевах, ігры на музычных інструментах.

У Швецыі ёсць "старыя" нацыянальныя меншасці, шмат і "новых" (арабы, паўднёвыя і ўсходнія славяне, індусы, афрыканцы, кітайцы). Па меры магчымасці фальклор нацыянальных меншасцей імкнуцца прадставіць на фестывалі, але гэта не з'яўляецца абавязковай умовай яго правядзення. Замежныя гурты звычайна не запрашаюць, хіба суседзяў — датчан і нарвежцаў.

Люблін

Люблін з'яўляецца цэнтрам ваяводства, таму па адміністрацыйнай значнасці яго можна параўноўваць са шведскім Ліншопінгам. Але горад усё ж большы: тут пражывае каля 350 тысяч чалавек. Імпрэзы, што папулярызуюць традыцыйную культуру, ладзяць тры грамадскія арганізацыі, таму фальклорных падзей праходзіць каля шасці на год.

На форум "Старэйшыя песні Еўропы" вольны ўваход. Аднак не ўсе фэсты горада могуць гэтым пахваліцца. "Ягелонскі кірмаш" — так. А вось на "Фальклорных Мікалайках" уваход вольны толькі на дзённыя мерапрыемствы: майстар-класы, канферэнцыю. За вечаровыя ж канцэрты давядзецца плаціць.

Імпрэзы "Старэйшых песень Еўропы" праходзілі ў розных будынках; абгароджанай тэрыторыі, як у Ліншопінгу, не было. Мо таму, што ўваход вольны, мо таму, што няма будынкаў з памяшканнямі для ўсіх відаў мерапрыемстваў. Праграма фестывалю складалася з навуковай канферэнцыі, вечаровых канцэртаў ды начных танцаў. Толькі на танцах гралі не аркестры, як у шведаў, а звыклыя нам невялічкія капэлі.

Этнічных меншасцей у Польшчы шмат. Але на люблінскіх фальклорных фестывалях яны не паказваюцца зусім. Неяк гэта не прынята. Мабыць, у бойкаў, лемкаў і гараляў свае, асобныя, фестывалі. Затое люблінцы арыентаваны на самае шырокае супрацоўніцтва з краінамі ўсходняй Еўропы: на фэсты часта запрашаюць беларусаў, украінцаў, сербаў, літоўцаў, славакаў, венграў.

Сёлета на "Старэйшых песнях Еўропы" побач з польскімі, сербскімі ды ўкраінскімі гуртамі выступілі беларускія бабулі з вёскі Залатуха Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. У Польшчы знайсці аўтэнтычных спявачак ужо вельмі складана, трохі лягчэй з музыкамі (у Беларусі — наадварот). Таму калінкавіцкіх бабуль віталі горача, пасля выступлення падыходзілі, каб пазнаёміцца ды падзякаваць. Да таго ж у палякаў, як і ў шведаў, гурты-пераймальнікі звычайна не выступаюць у традыцыйных касцюмах. Спецыяльнае сцэнічнае адзенне таксама не выкарыстоўваюць, але дамаўляюцца ўнутры гурта, хто ў чым будзе. Тады глядзіш: у адной спявачкі — чырвоны шалік, у другой — гэтага ж колеру калготкі, у трэцяй — ружа прышпілена... І гурт глядзіцца як адно цэлае. Беларуская постфольк-сцэна ў гэтым плане адрозніваецца: звычайна спявачкі імкнуцца аднавіць рэгіянальныя варыянты строяў.

У Любліне фальклорныя імпрэзы часта прысвячаюцца пэўнаму аспекту традыцыйнай культуры. Напрыклад, арганізатары "Ягелонскага кірмашу" сёлета акцэнтавалі ўвагу на выцінанцы і вяселлі. Тэматыкай жа "Старэйшых песень Еўропы" былі абраны матывы стварэння свету ў традыцыйных песнях. На канферэнцыі выкладчык Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Ірына Мазюк апавядала пра семантыку тэкстаў беларускіх калядак. Праз слова калядніки сімвалічна абнаўляюць, ствараюць свет, мадэлююць жыццё гаспадаркі, куды яны завіталі, на наступны год.

Выканаўцы імкнуліся падбіраць для фестывалю творы адпаведнай тэматыкі. У асноўным матывы стварэння свету сустракаюцца ў каляндарных песнях. Адгалоскі міфалагічнага мыслення назіраюцца і ў больш позніх пластах фальклору, напрыклад, у лірыцы.

Канешне ж, у Польшчы — бліжэйшы нам і больш звыклы фармат фальклорных фестываляў. Але і ў скандынаваў ёсць што пераняць для выкарыстання ў нашых рэаліях.

Фота аўтара

Музей пад прыватную калекцыю: чаму б і не?

Падзялюся "нататкамі на палях" семінара "Прыватнае калекцыянаванне і сучасны музей". Агучанае на сустрэчы можа быць цікавым як у кантэксце стварэння музеяў ды галерэй у нашай краіне, так і адносна прынцыпаў фарміравання калекцый.

ГЕРМАНІЯ

Семінар — частка праграмы Інстытута Гётэ, па якой у Беларусь запрашаюцца нямецкія прыватныя калекцыянеры. Так, прыватны збор Ленц Шэнберг прадставілі жонка ўладальніка калекцыі і яго правая рука Анна Ленц (яна прэзентавала збор у Мінску, а яе ўнёсак у існаванне калекцыі — адбор экспанатаў для выставак, іх прасоўванне, апісанні, фота- і відэаархіў сустрэч з мастакамі, а таксама — кніга ды стужкі пра лёсы жонак і сяброўак творцаў), мастацтвазнаўца і куратар Ульрыке Шміт, якая цягам васьмі гадоў працуе над апісаннем ды каталагізацыяй калекцыі, а таксама фатограф Расвіта Прос, што не першы год алічбоўвае творы для каталогаў.

Сам 86-гадовы сенатар Герхард Ленц не змог прыехаць у Беларусь, аднак яго жонка падзялілася фактамі ягонай біяграфіі. Так, увесь збор прысвечаны адной плыні ў мастацтве: кірунку "ZERO", заснаванаму ў Дзюсельдорфе. Сярод яго ўдзельнікаў — мастак-наватар Іу Кляйн, адна са значных фігур пасляваеннага еўрапейскага мастацтва. Сама ж група была заснавана 24 красавіка 1958-га Хайнцам Макам і Ота Піне; у 1961-м да іх далучыўся Гюнтэр Укер.

Члены суполкі лічылі пасляваеннае мастацтва нагружаным баластам мінулага, а таму шукалі новую кропку адліку, каб супрацьпаставіць драме Другой сусветнай вайны больш чысты і здаровы свет, напоўнены надзеямі ды ідэалістычнымі поглядамі. Назва ж пазначала фазу маўчання і цішыні, памежны стан, калі старое пераходзіць у новае. Прадстаўнікі плыні пашыралі мастацкія вопыты са святлокінетычнымі аб'ектамі, ствараючы новую пурыстычную эстэтыку ў прамежку паміж карцінай і скульптурай.

Увагу на гэтую плынь нямецкі калекцыянер звярнуў выпадкова, прыйшоўшы ў салон па акварэлі (у 1960-я ў Еўропе яшчэ можна было набыць па "ніштаватых" коштах жывапіс Маціса і Пікаса). Але кірунак "ZERO" цалкам заняў Ленца. Так, цягам пятнаццаці гадоў ён, не кантактуючы з мастацтвазнаўцамі і не знаёмячыся з творцамі, фанатычна скупляў работы сяброў суполкі (у практыцы калекцыянавання ў Беларусі — абыходзіцца без пасярэдніцтва галерэй ды набыць работу ў майстэрні).

Праз тыя паўтара дзясятка гадоў адзін з мастакоў прыехаў пазнаёміцца з "таемным прыхільнікам". З таго часу сям'я калекцыянераў займела зносіны з усімі прадстаўнікамі руху "ZERO". (Цяпер апошнія паступова сыходзяць, і разам з імі заканчваюцца творы кірунку.) А дзеці Ленцаў раслі ў асяроддзі твораў мастацтва і прынялі ўдзел у сямейным захапленні. Калекцыя часта дэманстравалася ў краінах Еўропы, у ЗША і ў Маскве. Пакаваннем, пагрузкай, развескай экспанатаў займаліся члены радзіны, паколькі выстаўкі часцяком мелі невялікую спонсарскую падтрымку. Дарэчы, у 2015 годзе калекцыю пакажа Музей Саламона Гугенхайма ў Нью-Ёрку. Праўда, Ленцы мяркуюць, што архітэктура ды інтэр'еры знакамітай пляцоўкі не цалкам адпавядаюць духу калекцыі, і спатрэбяцца дадатковыя плошчы, каб прадэманстраваць збор у найлепшым ракурсе.

Але найбольшы клопат сям'і калекцыянераў палягае ў тым, што Германія не займаецца дзяржаўным фінансаваннем прыватных калекцый, а іншай магчымасці стварыць музей на радзіме ў Ленцаў няма. Быў складзены каштарыс, прыдуманы праект. Але нават калі сям'я ўклала б усе ўласныя сродкі ў стварэнне музея, то іх хапіла б толькі на ўзвядзенне будынка і яго аздабленне, — утрымліваць жа памяшканне ды штат работнікаў не было б за што.

Ленцы прадэманстравалі б сваю калекцыю і ў Беларусі, але, на жаль, прафінансаваць падобны праект пакуль няма каму, дый не так шмат музеяў, здольных прадаставіць тэхнічна абсталяваныя плошчы запатрабаванага ўзроўню.

А пад час наведання сталіцы гасцям спадабаліся інтэр'еры гатэля "Еўропа", дзе і ладзіўся семінар. Яны, нагадаю, аздоблены манументальнымі работамі Валерыя Даўгалы. А пасля афіцыйнай часткі немцы пабывалі ў майстэрнях Руслана Вашкевіча і Уладзіміра Цэслера.

Таццяна МАРКІНА,
калекцыянер

Скрыпічных спраў майстар Сяргей Мышкоўскі на гэтым тыдні **перадаў скрыпку** ў фонды Музея гісторыі горада Гомеля.

Гэтыя словы належаць Аляксандру Пятровічу Мазалёву, таленавітаму беларускаму жывапісцу, графіку і педагогу, які ў час Вялікай Айчыннай прайшоў цяжкі шлях мужнага падпольшчыка ды вязня фашысцкіх канцлагераў, а скончыў сваю вайну гвардыі радавым Чырвонай арміі. І, нягледзячы на цяжкае раненне ў галаву, — да канца свайго нядоўгага жыцця працягваў рабіць улюбёную справу: маляваць Радзіму ды выхоўваць маладое пакаленне мастакоў…



Аляксандр Мазалёў.

"Мяне двойчы вывозілі на расстрэл…"

Барыс КРЭПАК

Невялічкі гарадок Рудня размешчаны на беразе Малой Бярэзіны — за 70 кіламетраў ад Смаленска, амаль на мяжы з Беларуссю. Тут і жылі галоўным чынам беларусы. Да рэвалюцыі — звычайная вёска, якая тады ўваходзіла ў Аршанскі павет Магілёўскай губерні: аднапавярховыя хаткі з перакошанымі аканіцамі, драўляныя платы з павырыванымі штыкецінамі. А вуліцы пасля дажджу станавіліся амаль непраходнымі для жыхароў.

Тут, на ўскраіне адной з вуліц, у вялікай, але беднай сялянскай сям'і Пятра Мазалёва 21 лютага (па старым стылі) 1910 года і нарадзіўся будучы мастак. Бацька, каб пракарміць радзіну, з усяе сілы працаваў у сельскай гаспадарцы, займаўся таксама прыробкам. І няма нічога дзіўнага, што дзяцінства Шурыка праходзіла ў штодзённых працах ды турботах.

Праўда, кожную вольную часіну юнак маляваў усё бачанае навокал — прыроду, людзей, жывёл, птушак, — капіраваў рэпрадукцыі з тых рэдкіх часопісаў, якія цудам трапілі ў вёску са Смаленска ды Віцебска. Дзевяцігодку Рудзянскай сярэдняй школы юнак скончыў паспяхова і з блаславення бацькі паехаў у Віцебск, дзе ў 1927-м з першага разу паступіў у Мастацкі тэхнікум.

Але, як піша Аляксандр Пятровіч у сваёй аўтабіяграфіі, "праз некалькі месяцаў вымушаны быў пакінуць тэхнікум па прычыне дрэннай матэрыяльнай забяспечанасці". Хаця ў прыватнай гутарцы са мной ён сказаў, што, апроч таго, яго не задаволіла сістэма тагачаснага навучання. Дый са сваім настаўнікам Уладзімірам Хрусталёвым ён не знайшоў агульнай мовы. У пошуках "лепшай долі" ў сэнсе творчасці Мазалёў паехаў у Маскву, паступіў у студыю АХРР (Асацыяцыя мастакоў рэвалюцыйнай Расіі), але і яе хутка кінуў: тут вучоба таксама не прыйшлася даспадобы. Наогул, гэты перыяд дэпрэсіі "ў пошуках сябе" Аляксандр Пятровіч не асабліва любіў прыгадваць. Казаў, што быў на мяжы расчаравання ў мастацтве, бо нічога яму тады не падабалася, і не ведаў ён, што далей рабіць.

Мазалёў вярнуўся ў Рудню, каб працаваць у толькі што арганізаваным калгасе. Спачатку загадваў хатай-чытальняй, потым — кіраваў ячэйкай ОСОАВИАХИМа ды афармляў сценгазеты. Потым, прымаючы пад увагу адоранасць юнака ў галіне рысавання і актыўную грамадскую дзейнасць, кіраўніцтва арцелі "Запаветы Ільіча" накіравала Аляксандра на вучобу ў Ленінград.

Але перш чым трапіць у Інстытут пралетарскага выяўленчага мастацтва (тады ён так называўся), яму давялося цэлы год наведваць вячэрні рабфак пры інстытуце ды адначасова папрацаваць грузчыкам у гандлёвым порце. І толькі ў верасні 1931-га яму пашанцавала: ён стаў паўнавартасным студэнтам найлепшай па тым часе ў краіне мастацкай установы, дзе ягонымі настаўнікамі на факультэце жывапісу сталі такія вядомыя педагогі, як Аляксандр Савінаў, якога называлі "прыміраным Урубелем", Дзмітрый Кардоўскі, Канстанцін Юон, "чалавек абсалютнага жывапіснага слыху" Аляксандр Асмёркін і, канешне, Рудольф Фрэнц, які стаў у Мазалёва кіраўніком дыпломнай карціны "Апошняе вандраванне", прысвечанай цыганам, што імкнуліся весці аселы вобраз жыцця.

Але асаблівая памяць засталася ў Мазалёва пра Аляксандра Савінава. Сёння яго мала хто ведае як жывапісца, але ў свой час многія ягоныя карціны прыводзілі ў захапленне і спецыялістаў, і публіку. Напрыклад, "Купанне коней у Волзе" (я бачыў работу ў запасніках Рускага музея) — рэч вельмі добрая. Яе часта прыгадваў і Мазалёў у нашых гутарках.

А яшчэ Аляксандр Пятровіч з горыччу мне распавядаў, як у 1937-м разагналі курс Савінава за "палітычна шкодны фармалізм", за "змрочнасць і цемнату жывапісу", за тое, што кіраўнік майстэрні катэгарычна адмаўляў прынцып так званага мелкага рысавання, тыповымі адэптамі якога былі І.Бродскі і яго верны вучань А.Лактыёнаў з іх сухім ды халодным пэндзлем. Пасля разгону курса студэнту Мазалёву давялося перайсці ад Савінава ў батальны клас педагога Рудольфа Фрэнца. На жаль, Савінаў на пачатку 1942-га памёр у блакадным Ленінградзе, калі яму толькі споўнілася шэсцьдзясят…

Але мала хто ведае, што ўлюбёны настаўнік Мазалёва паспеў прыняць удзел у эвакуацыі Эрмітажа. З-за недахопу часу, калі немцы былі ўжо блізка, супрацоўнікам галоўнага музея краіны часта даводзілася зразаць палотны з падрамнікаў і скручваць у трубкі. Савінаву было даручана дэмантаваць творы Рэмбранта. Адмовіўшыся ад хуткага метаду, ён колькі сутак ляжаў на падлозе, акуратна вымаў старадаўнія дробныя цвікі ды мацаваў палотны да падрамнікаў — без адзінага пашкоджання. І потым асцярожна ўпакоўваў шэдэўры ў спецыяльныя скрыні. Тое быў апошні акт любові Савінава да мастацтва. Ну а многія творы самога мастака зніклі ў гады блакады. Калі я расказаў аб гэтым Мазалёву, ён проста праслязіўся (а я дазнаўся пра гісторыю тую, калі праходзіў курсавую ўніверсітэцкую практыку ў Эрмітажы)…

Тут, у Ленінградзе, Мазалёў пасябраваў з Яўгенам Зайцавым, які скончыў інстытут на год раней за яго, і пасля абароны сваёй цудоўнай дыпломнай карціны "Чапаеў" паехаў у Мінск. Упершыню Аляксандр Пятровіч сустрэўся і пасябраваў з Яўгенам Чамадуравым, які, праўда, вучыўся на суседнім факультэце сцэнаграфіі. Ды абодва яны скончылі інстытут у адзін год. Сярод іншых сакурснікаў і студэнтаў іншых курсаў Мазалёў прыгадваў добрым словам Анатоля Казанцава з яго карцінай "Сцяпан Разін", Анатоля Андрэева з дыпломам пра рэйд Будзённага на Царыцын, Барыса Расленку-Рындзенку з карцінай пра Фрунзэ, што прыехаў на агляд у 25-ю дывізію Чапаева. Згадваў і Барыса Генадзіева — аўтара дыпломнай кампазіцыі, ізноў жа, пра Фрунзэ ды Чапаева, і Рыгора Ксенафонтава, які атрымаў выдатную ацэнку за карціну "Першая конная Сямёна Будзённага"… Вось прыкладна такія тэмы былі ў фаворы на той час у савецкіх настаўнікаў ды дыпломнікаў.

І, такім чынам, наш Мазалёў быў у гэтых адносінах нейкай "белай варонай" сярод мастакоў-песняроў герояў Грамадзянскай вайны і "комиссаров в пыльных шлемах". Валянціна Назаранка, аднагрупніца Мазалёва, паспрабавала выйсці ў дыпломе за межы такіх сюжэтаў, намаляваўшы брыгаду стомленых, змораных ад турбот камбайнёраў, але з цяжкасцю выклапатала сабе тройку. А што адчуваў рызыкоўны Аляксандр Пятровіч з яго цыганамі? Наогул, тэма не лезла ні ў якія вароты. Хаця…

Сем гадоў навучання не прайшлі дарэмна. Іх Мазалёў прыгадваў як лепшыя ў жыцці. Менавіта тады ён бліскуча авалодаў малюнкам ды многімі сакрэтамі тэхнікі жывапісу і кампазіцыі. І як вынік — за курсавыя творы быў двойчы ўзнагароджаны грашовымі прэміямі так званага першага разраду: нялішняя матэрыяльная падмога для беднага студэнта. Яму цягам навучання ў вольны час даводзілася працаваць на розных работах, каб мець нейкія грошы на пражыццё, на фарбы, пэндзлі. Стыпендыі ж не хапала, а з дому дапамогі не было…

Але здарылася нечаканае: Аляксандр цяжка захварэў у разгар працы над дыпломам. Адбылася складаная аперацыя на правай кісці, і ў выніку давялося на чатыры месяцы забыцца пра дыпломных цыганоў. Але Дзяржаўная экзаменацыйная камісія, прагледзеўшы сабраны для палатна матэрыял, знайшла магчымым дазволіць студэнту абарону праз год.

У свой час я спытаў Аляксандра Пятровіча, чаму раптам ён абраў такую рэдкую і коўзкую для тагачаснага савецкага выяўленчага мастацтва тэму, як жыццё цыганоў? Ён адказаў, што, па-першае, гэта была прапанова кіраўніка дыплома Рудольфа Фрэнца (ён тады яшчэ прафесарам не стаў), па-другое, Мазалёву тэма была добра знаёмая яшчэ на радзіме. Так, у Віцебскім раёне ў 1927-м у сядзібе Міхалова быў заснаваны першы ў СССР цыганскі калгас "Новае жыццё", а хутка — і другі, у Жлобінскім раёне. Дый у самім Віцебску ў 1930-я працавала сямігадовая цыганская школа. І наогул, менавіта ў тыя часы ўвага да жыцця савецкіх цыганоў была вельмі значная, з пункта гледжання ідэалагічнага і эстэтычнага: з'явіўся першы ў свеце цыганскі тэатр "Рамэн", мастацкі фільм "Апошні табар" з Ляляй Чорнай, Мікалаем Мардвінавым і Міхаілам Яншыным, цыганскія часопісы, арцелі, распрацоўвалася нават цыганская пісьменнасць. Словам, тое быў час, калі качавых цыганоў амаль гвалтам імкнуліся "саджаць на зямлю".

А вось у выяўленчым мастацтве ў гэтым сэнсе мелася "белая плямa", і, такім чынам, можна лічыць, што беларус Аляксандр Мазалёў быў ледзь не "піянерам" у адлюстраванні жыцця цыганоў ды тых канфліктаў, якія тады адбываліся паміж большасцю качавых цыганоў і цыганоў аселых.

Карціну гэтую я не бачыў нават у рэпрадукцыі: яна кудысьці знікла, мабыць, у час вайны, а можа, дзесьці і сёння "нудзіцца" ў нейкіх музейных фондах. Не ведаю. Але, па словах аўтара, яна ў яго атрымалася, асабліва па трывалым, канструктыўным малюнку ды "экзатычным" каларыце. Як вынік — добрая адзнака. Не выдатная, але добрая: усё ж трошкі збянтэжыла экзаменатараў нязвыклая тэма…

Атрымаўшы дыплом, натхнёны ўдачай Мазалёў у лістападзе 1938 года быў накіраваны на Украіну, у горад Варашылаўград (цяпер — Луганск) на пасаду выкладчыка мясцовага Мастацкага вучылішча. Акрамя педагогікі, ён, канешне ж, шмат займаўся творчасцю. Пісаў пейзажы, нямала працаваў алеем ды акварэллю, таксама зрабіў неблагую серыю малюнкаў з жыцця Тараса Шаўчэнкі, якая адразу ж увайшла ў экспазіцыю Гарадскога мастацкага музея.

Але мастаку доўга тут працаваць не давялося: ужо ў жніўні 1939-га па запрашэнні ўпраўлення па справах мастацтва БССР ён едзе ў Віцебск у якасці выкладчыка жывапісу і малюнка ў Мастацкае вучылішча. Да гэтага часу належаць два варыянты карціны "Гродна. 1939 год", прысвечанай уз'яднанню заходніх абласцей Беларусі з БССР. Таксама працаваў Мазалёў над палатном "Камкор Сямён Цімашэнка на манеўрах Беларускай ваеннай акругі", але карціна засталася незавершанай: пачалася Вялікая Айчынная вайна…

К

Аляксандр Мазалёў. "Ускраіна Мінска".

Аляксандр Мазалёў. "Натюрмортык".

Што вы ведаеце пра Аляксандра Мазалёва?

Працяг аповеду пра Аляксандра Мазалёва — **у наступных нумарах "К".**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст."
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст."
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст."
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст."
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст."
Выстаўкі:
■ Выстаўка **"Эдо. Сталіца і эпоха. Японская гравюра ўкіё-э XVIII — XIX стст. са збору Дзяржаўнага Эрмітажа"** — да 20 снежня.
■ Выстаўка жывапісу сям'і Шыбнёвых **"Сто твораў за сто гадоў"** — да 17 лістапада.
■ Выстаўка заходнееўрапейскай моды кан. XIX — пач. XX стст. са збору Ігара Сурмачэўскага **"BELLE EPOQUE"** — да 1 снежня.
■ Выстаўка твораў Івана Дмухайлы **"Прыгажосць на стагоддзі"** — да 10 лістапада.

Арт-кафэ музея
■ Выстаўка работ Аляксея Несцерава **"Агмень"** — да 24 лістапада.
■ Выстаўка гравіраванага шкла Аляксандра Фокіна **"Паміж святлом і ценем"** — да 17 лістапада.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.

■ Пастаянная экспазіцыя.
Выстаўка:
■ Выстаўка **"Самабытныя вобразы сучаснасці"** — да 25 лістапада.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

■ Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст.".**

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 00 05.

Экспазіцыі:
■ "Старажытная Беларусь".
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".
Выстаўкі:
■ Выстаўка **"Музей шакаладу "Nikolya"** — да сакавіка 2015 года.
■ Выстаўка графікі **Уладзіміра Шаркова** — да 20 лістапада.
■ Выстаўка **"Музей ёлачных цацак"** — да 15 лютага 2015 года.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а.
Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыя:
■ "Мінск губернскі ў кан. XIX — пач. XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езда РСДРП".
Выстаўкі:
■ **"Васковыя фігуры"** і **"Аўто на далоні"** — да 15 студзеня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.

Тэл.: 327 46 12.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Гісторыя і сучаснасць беларускага хакея"** — да 14 лістапада.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:
■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
Выстаўка:
■ **"Экзатычны мір"** — да чэрвеня 2015 года.

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 9А.
Тэл.: 237 46 94.
■ Выстаўка **"Велізарныя цмокі"** — да 15 студзеня 2015 года.

г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 151/1.
Тэл.: 291 99 51.
Экспазіцыі:
■ "Жывёльны свет Беларусі ў сезоннай дынаміцы".
■ "Каляводныя жывёлы".
■ "Птушкі нашага горада".

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
Выстаўка:
■ **"Тэатр сваімі рукамі. Цікавы занятак для дзяцей і дарослых"** — да 9 лістапада.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.
Экспазіцыя:
■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
Выстаўка:
■ **"Alma Mater & Cinema"** — да 29 лістапада.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14.
Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка **"Вялікая і забытая"**, прысвечаная Першай сусветнай вайне, — да 18 студзеня.
■ Выстаўка люлек **"Прадмет годнага адпачынку"** — да 1 снежня.

Ратуша
■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка фатаграфій **"Мір стары — Мір новы".**
■ Выстаўка **"Даспехі Заходняй Еўропы XVI — XVIII стст." .**

Партрэтная зала
■ Выстаўка **"Партрэты князёў Радзівілаў з калекцыі князя Канстанціна Гагенлоэ"** (Германія) — да 16 лістапада.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра".**
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыя:
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
Выстаўка:
■ Выстаўка мастацкай фатаграфіі Валерыя Вядрэнкі **"Святло Вязынкі"** — да 15 лістапада.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10.
Тэл.: 321 24 30.

■ Выстаўка скульптуры Уладзіміра Жбанава **"Ад мяне"** — да 31 мая 2015 года.
■ Выстаўка **"Мінск на старых паштоўках"**.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
Выстаўкі:
■ Выстаўка **"Дэжавю кіно"** — да 14 лістапада.
■ Выстаўкі, прысвечаныя 140-годдзю з дня нараджэння першага Прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль Хаіма Вейцмана і прадстаўленыя ў рамках Дзён Хаіма Вейцмана ў Беларусі, **"Цуды часам здараюцца, але над гэтым трэба добра папрацаваць"** і **"Ізраіль — краіна інавацый"** — да 14 лістапада.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**
Выстаўка:
■ Выстаўка **"Gloria Patria"** — дакументы, карты, прадметы хрысціянскага культу з прыватнай калекцыі Ігара Сурмачэўскага — да верасня 2015.
■ Выстаўка Юрыя Каралевіча **"Рэмінісцэнцыя"** — да 16 лістапада.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж".
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры к. XIX — с. XX стст.

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, пр-т Ракасоўскага, 49.
Тэл.: 291 16 76.

Экспазіцыі:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Л.Шчамялёва".**
Выстаўка:
■ Выстаўка работ Ганны Гадзіравай **"Палітра вандравання"** — да 14 лістапада.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца
Выстаўкі:
■ Выстаўка фатаграфіі Марціна Странкі **"MONO"** (работы прадастаўлены Пасольствам Чэшскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь) — да 16 лістапада.
■ Выстаўка, прысвечаная 95-годдзю стварэння Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, **"Музею — 95"** — да 30 лістапада.
■ Выстаўка фота Сяргея Халадзіліна **"Пастскрыптум"** — да 30 лістапада.
■ Міжнародны выставачны праект **"Рэчы паміж жыццём і смерцю"**, падрыхтаваны Музеем Арміі Стакгольма, — да 30 лістапада.
■ Выстаўка **"І старажытныя прадметы беражліва захоўваючы..." Са збору музейнай калекцыі археалогіі".**
Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
■ Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца
Экспазіцыя:
■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**
Выстаўкі:
■ **"Кнігі, у якіх захоўваецца час..."** (лепшыя выданні сяр. XVII — пач. XX стст.) — да 30 лістапада.
■ **"Рэтра-Гомель"** — да 30 лістапада.

Паўночнае крыло палаца
Экспазіцыя:
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны".**
Выстаўкі:
■ Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад
■ Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі".**
■ Выстаўка з Бранскай універсальнай бібліятэкі імя Ф.Цютчава **"Дарогамі Перамогі"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.
Выстаўкі:
■ **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна..."**.
■ **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст."**.
■ Выстаўка адной карціны **"Партызаны".**
■ **"Прывітанне, ранейшая Ліда!"**.
■ **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
■ Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.
■ **"Крылы над Лідай"** — выстаўка да 100-годдзя Лідскага аэрадрома.
■ Выстаўка **"Як жылі нашы продкі"**.
■ Выстаўка **"Чарадзейны куфар"**.
■ Выстаўка творчых работ выпускнікоў і выкладчыкаў мастацкай школы **"Сустрэча пакаленняў"**.
■ Персанальная выстаўка П.Цімафеева **"Драматычнасць сярэдняга плана. Час жывых"**.
■ У рамках праекта "Выток Нёмана — выток духоўнасці" — калектыўная выстаўка **"Абуджэнне"**.
■ Выстаўка дэкаратыўна-прыкладной творчасці А.Чуўюравай (Сярко) **"Частка маёй душы".**
■ **"Вайны свяшчэнныя старонкі"** — выстаўка, прысвечаная Вялікай Перамозе.
■ Выстаўка **"Старонкі непа-100ронняй Вялікай вайны на Лідчыне"**.

ЛІДСКІ ЗАМАК

■ Камера катаванняў.
■ Фотавыстаўка **"Захаваем на вякі".**
■ Партрэтная галерэя вялікіх князёў і каралёў.
■ Фотавыстаўка **"Археалагічныя знаходкі Лідскага замка"**.
■ Выстаўка рэплік **"Зброя Вялікага Княства".**

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Сумесная з Беларускім саюзам дызайнераў выстаўка **"ПаСТУ-Лат"** (дызайн, арт-аб'екты, фота, жывапіс, скульптура, відэаарт) — да 22 лістапада.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс.: 290 60 10.

■ Выстаўка **"Tour de Беларусь. Пралог"** — да 9 лістапада.
■ Персанальная выстаўка да 70-годдзя **Уладзіміра Напрэнкі** — да 9 лістапада.
■ Выстаўка секцыі "Пагоня" БСМ **"АРТ-ВОРША-РУБОН!"** — да 9 лістапада.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.
■ **8 — "Кашчэй Бессмяротны"** (опера) М.Рымскага-Корсакава; **"Шахразада"** (балет) М.Рымскага-Корсакава.
■ **9 — "Чароўная музыка"** (опера ў 2-х дзеях) М.Мінкова. Пачатак а 12-й.
■ **9 — "Жар-птушка"** (балет) І.Стравінскага; **"Шахразада"** (балет) М.Рымскага-Корсакава. Пачатак а 19-й.
■ **11 — "Набука"** (опера ў 4-х дзеях) Дж.Вердзі.
■ **12, 14 — "Жызэль, або Вілісы"** А.Адана. Пачатак а 19-й.
■ **12 — Вечар рамансаў у Камернай зале** — Музычныя вечары ў Вялікім. Пачатак у 19.30.
■ **13 — "Травіята"** Дж. Вердзі.
■ **15 — "Кармэн"** (опера ў 3-х дзеях) Ж.Бізэ.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7.
Тэл./факс: 327 60 81.
■ **8, 9 — "Вяселле"** А.Чэхава.
■ **11, 12 — "Тата"** Д.Багаслаўскага.
■ **13 — "Офіс"** І.Лаўзунд.
■ **14 — "Лістапад. Андэрсен"** А.Паповай.
■ **15 — "Ноч на Каляды"** паводле М.Гогаля.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.
■ **8 — "Ліфт"** Ю.Чарняўскай.
■ **9 — "А мне не сорамна!.."** Л.Усцінава. Пачатак аб 11-й.
■ **9 — "Дажыць да прэм'еры"** М.Рудкоўскага.
■ **10 — "Па імені Спадар"** Ф.Лёле.
■ **11 — "Нямое каханне"** — аўтарскі праект Ігара Сігова.
■ **12 — "Інтымны дзённік (Дзённік паэта)"** С.Кавалёва.
■ **13 — "Тры Жызэлі"** А.Курэйчыка.
■ **14 — "Купала. Кругі раю"** С.Навуменка.
■ **15 — "Два чароўныя парасоны (Стойкі алавяны Салдацік)"** С.Навуменка. Пачатак а 12-й.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.
■ **8 — "Залатое кураня"** В.Уланоўскага. Пачатак у 11.30.
■ **8 — "Юнона" і "Авось"** А. Рыбнікава. Пачатак а 19-й і а 21-й.
■ **9 — "Бураціна.BY"** А.Рыбнікава. Пачатак у 11.30.
■ **9 — "Бабскі бунт"** Я.Пцічкіна. Пачатак а 19-й.
■ **10 — "Дуброўскі"** К.Брэйтбурга.
■ **11 — "Тысяча і адна ноч"** Ф.Амірава.
■ **12 — "Мая жонка — ілгуння"** В.Ільіна, В.Лукашова.
■ **14 — "Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.
■ **14 — "Вестсайдская гісторыя"** (мюзікл у 2-х дзеях) Л.Бернстайна.
■ **15 — "Чароўная лямпа Аладдзіна"** М.Самойлава. Пачатак у 11.30.
■ **15 — "Лятучая мыш"** І.Штрауса. Пачатак а 19-й.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **8 — "Жыў-быў Заяц"** М.Шувалава. Пачатак аб 11-й (8) і ў 13.30 (8).
■ **9 — "Сунічкі для Веліканачкі"** М.Шувалава. Пачатак аб 11-й.
■ **12 — "Нататкі вар'ята"** паводле М.Гогаля. Пачатак а 19-й.
■ **13 — "Кветачка-вясёлачка"** В.Катаева. Пачатак у 10.30 і а 13-й.
■ **14 — "Асцярожна, Соня!"** А.Усачова. Пачатак а 10-й і а 12-й.